Жыве Беларусь!

Пагоня

Грамадзка-палітычная газэта Заснавана ў 1920 г.

№ 1 (15) 6—22 студзеня 1993 г. Кошт 3 рублі

З НОВЫМ 1993 ГОДАМ!

Язэп ПУШЧА

ВІНШАВАНЬНЕ

Вее вецер, вее сьвежы,
Ходзіць з песьняй па бары.
Адыходзіць месяц сьнежань,
Адыходзіць год стары.

Хмары ясных зор ня засьцяць,
Надыходзіць Новы год.
З Новым годам, з новым шчасьцем,
Беларускі мой народ!

НА КУЦЬЦЮ

Брату, згубіўшаму Хрыста...

Марозная калядная ноч... Над зямлёю Беларусі прывабна мігцяць нябесныя зоркі, час ад часу ўздрыгваюць, аздабляючы Млечны Шлях, што распасьцёрся ў бясконцых Вышынях Гасподніх. Нерухома замерлі зорныя знакі задыяку, адмераўшы злое і добрае чалавечым хцівасьцям на цэлы рок...

Урачысты Сусьвет зноў прычакаў Дня Нараджэньня Хрыстовага. Сьледам Віфлеемскай зоркі час ад часу пралятаюць нябесныя камэты, пакідаючы стромкія знакі і праракуючы шчасьлівую долю тым, хто нарадзіўся ў гэты час...

Калядная ноч — Хрыстова ноч, ноч Надзеі, Нараджэньня і Адраджэньня люду Беларусі. І зноўку наша Маці-Радзіма будзе накрываць калядны стол для дзяцей сваіх і народу паспалітага...

А на Зямлі — час аблуды, хцівасьці, здрады і захопніцтва земляў і душаў людзкіх ніяк яшчэ не сканае, цягнецца праз гады пякельны сьлед зоркі Чарнобыль...

... Духоўная пустэча...

... Табе, мой згублены Брат, шлюць вітаньне адзінокі калядны стол у бацькавай хаце, не дагледжаныя табою магілы родных, не перапрошаныя крыўды і сьлёзы Маці, Радзімы, здранцьвелыя ад холаду і узьнятыя да Неба рукі-гольлі дрэваў, душы ўсіх памерлых Дзядоў, што сабраліся на куцьцю да свайго нашчадка, які амаль страціў памяць, годнасьць, розум, сумленьне і мову...

... Цябе, мой згублены Брат, вітаюць заплаканыя ад зімы вокны роднага жытла, бо ня ведаюць, як хутка ты збудзеш яго каму-небудзь, каб напхаць доўгімі рублямі кашэль сваёй змалпаванай паловы, што сноўдае крумкачом над зьдзічэлым бацькавым гняздом...

... І пакарае цябе Бог, няверны Брат, праз дзяцей тваіх, бо яны ўзялі тваю навуку...

... Калядная пара. Піліпаў пост. Сьцішэньне душы і цела. На местачковых вулках шпацыруе люд, што паціху вар'яцее ад дзікага рынку. Некаторыя яшчэ знаходзяць час зайсьці ў каталіцкую ці праваслаўную бажніцу, гавораць пацеры, спраўляюць абрад, глядзяць Богу ў вочы, слухаюць паўпалітычныя казаньні і... застаюцца бяз Боскай перамены ў душы і сэрцы...

... Калядны час... Насустрач даўняя знаёмая, сталага веку кабеціна. Твар зацяты. Злосна тузае мой рукаў і пытае, чаму я ня іду маліцца, а калі іду, то чаму не туды, куды яна. А я іду, іду з думкай пра Бога, Яго Сына... Яна ж толькі што выйшла з храма!..

Спыніўся, не пайшоў у бажніцу на тую казань. Злосныя вочы кабеты засталіся перада мною ў калядным холадзе. Хрыстос так і не нарадзіўся ў яе сэрцы, дзе знайшла свой прытулак палітыка нянавісьці. Яна падзяляе людзей на сваіх і ворагаў на вуліцы і ў бажніцы, а мо і пры калядным стале..

Калядны стол Беларусі! Цягнуцца да цябе ўсе: і шукальнікі «исконных земель», і «крэсавякі», і «самасційнікі». Жыруюць і бязбожнікі, забыўшыся на пост і павагу да народа-гаспадара. Смачна ядуць, бяруць і цягнуць, прысвойваюць і... не дзякуюць...

... Нехрыстовыя, багатыя жабракі!..

... Куцьця... Куцьця... Стол з сенам пад белым абрусам. У покуце — абразы, посныя стравы на стале, сярод іх — куцьця. Прыгатавала Маці. Бярэм па лыжцы кожнае стравы, хрысьцімся, смакуем. Паблісквае сьвечкамі і цацкамі прыбраная ялінка. Ціха гамонім, слухаем адзін аднаго, сваё сэрца, думаем пра Жыцьцё, пра тых, хто адыйшоў у лепшы сьвет... З-пад абруса на стале кожны выцягвае па адной сяніне. Калі трапіцца доўгая травінка — будзеш мець жыцьцё доўгае і заможнае. Жадаем адзін аднаму моцнага здароўя, шчасьця, радуемся нараджэньню Сына Божага Хрыста, сьпяваем калядкі...

... Марозная калядная ноч на зямлі Беларусі. Прывабна мігцяць зоркі нябёсныя... Дай, Божа, каб з нараджэньнем Сына Твайго Хрыста адрадзілася наша зямля, ачысьціўся душою беларускі народ. Няхай міне нас лёс раскіданага гнязда і Хрыстос народзіцца ў сэрцы кожнага жыхара Беларусі!

Міхась АДАМІН.

Андрэй ПЯТКЕВІЧ

◇◇◇ НОВЫ ГОД ◇◇◇

Б'юць куранты над Масквою—
Новы год прыйшоў да нас.
Зычуць жыцьцё залатое,
Зычуць шчасьлівейшы час.

Навакол сьпяваюць песьні,
П'юць гарэлку і віно.
Станеш, вокал азірнешся—
Штосьці шчасьця ня відно.

Абяцаюць, абяцаюць—
Будуць грушы на вярбе.
Абяцаюць — а што маюць?
Усё сабе, сабе, сабе.

Сьмех і радасьць у народзе—
Над Масквой куранты б'юць.
Дык ці возьмем у Новым годзе
У абяцанках што даюць.

Налівай, народ, гарэлку,
Прапівай свой Новы год.
Але заўтра нас сустрэнуць
Сто мінулашніх клапот.

Заўтра зноў круціцца будзем,
Як ваверка, тыдні ўсе.
Дык калі нарэшце цуды
Новы год нам прынясе?

1.01 1987 г.

СЬЦІСЛЫМ РАДКОМ

■

Ад сьнежня ў гарадзенскім друку забаронена прымаць абвесткі ад ахвотных набыць каляровыя мэталы, ордэны і мэдалі, а таксама ад тых, хто прапануе ўсялякія аракульскія паслугі. Падобныя абвесткі спрыяюць у дзейнасьці розным дзялкам. Аднак, калі застаўся попыт, будзе па-ранейшаму й прапанова. Абвесткі ж, як-ніяк, дапамагалі працаваць і праваахоўнікам.

■

Як стала вядома з неафіцыйных крыніц, у Горадні адбыўся сход прыхільнікаў аднаўленьня СССР, пераважна расейскіх афіцэраў. Завадатарам зьяўляецца былы штабіст палкоўнік Пастухоў. Як бачым, ворагі маладой Беларускай дзяржавы гуртуюцца. Лепей бы яны аднаўлялі гэты СССР у сябе ў Расеі, аднак дома ім жыць не падабаецца, а Рэспубліку Беларусь лічыць сваім домам таксама не жадаюць.

■

Белы хлеб робіцца хлебам для заможных. «Дарожны» каштуе 48 рублёў, а паляніца — ажно 72. Тым жа часам, уважаючы на пэнсіянерай, жытняя «цагліна» паранейшаму ,каштуе ўсяго 9 рублёў, цану на яе не павышаюць. Як там ні было, але жыцьцё на Беларусі пакуль самае таннае з усіх «братніх» рэспублік.

П. С.

НОТАБЭНЭ

14 першых нумароў «Пагоні» за папярэдні год — якія-ніякі, але вынік. Распачаць газэту няпроста, яшчэ цяжэй працягнуць выданьне. Летась мы зрабілі асноўнае: здолелі выдаваць яе пэрыядычна, стварылі ёй пэўнае аблічча, імкнуліся асьвятляць надзённыя пытаньні грамадзка-палітычнага жыцьця краіны, умацаваньня дзяржаўнага суверэнітэта. Але цяпер гэтага, мабыць, замала.

Сёньня «Пагоня» займае сваё вызначанае месца ў газэтных шапіках, нас чытае адна чысяча гарадзенцаў і тысяча жыхароў вобласьці, частку тыражу мы дасылаем у Менску, Вільню і Беласток. Мы напэўна будзем распаўсюджваць сваю газэту шырэй па Беларусі, аднак да нас таксама канчальна прыйшло усьведамленьне таго, што сапраўдная роля «Пагоні» — быць рэгіянальным, адзіным на этым абшары, беларускім незалежным выданьнем, а нашая галоўная вымога: асьвятляць усе падзеі з беларускага пункту гледжаньня.

Кожная, аднак, рэдакцыя зацікаўлена каб пашыраць кола сваіх чатачоў. Людзям жа замала адной палітыкі, ім патрэбны навіны і штось для хатняга чытаньня. Мы таксама маем наперадзе друкаваць болей навінаў, хатнія і гаспадарскія парады, а пры штотыднёвым выпуску (з паловы году, а можа й раней) абавязкова — тэлепраграмы. Спадзяемся, што ў нас пабольшае і дапісчыкаў, якія ня толькі будуць пісаць лісты, але прапануюць цікавыя карэспандэнцыі, допісы ў любым жанры. Гэтым самым вы дапаможаце нам зрабіць «Пагоню» цікавейшай.

Неадназначным ёсьць пытаньне з моўным абліччам нашай газэты. Некаторыя лічаць, што «тарашкевіца» палохае шмат якіх магчымых чытачоў «Пагоні». Спрэчнае меркаваньне. Загваздка, мабыць у іншым. Мы перакананы, што поўнае вяртаньне архаічнай граматыкі Б. Тарашкевіча сёньня немагчыма. Мова жыла іншым жыцьцём цэлыя 60 гадоў. Безумоўна, усяму чужацкаму, недарэчнаму ў ёй мы адмаўляем. Тым ня менш наўрад ці могуць для нас гучаць цалкам натуральна словы «плян» або «кляса». Аднак мягкасьць альбо наадварот — цьвёрдасьць зычных гукаў неабходна пазначаць пры пісаньні, бо яны натуральна й абавязкова гучаць пры маўленьні. Такім чынам, наш правапіс крыху адрозьніваецца ад практыкаванага іншымі незалежнымі газэтамі. Крыху двухсэнсовае становішча. І ўсё адно прапанова вярнуцца ва ўзлоньне «наркомаўкі», якою не выдавалася аніводная з «Пагоняў», каторыя калі-колечы існавалі, здаецца нам недарэчнай.

І апошняе. Мы сутыкнуліся з досыць цікавай зьявай беларускага жыцьця. Як вядома, дзе два беларусы, тамака існуюць тры партыі. Нас, каго цікавіць не адно вараная кілбаса, зусім няшмат. Місія «Пагоні» — згуртаваць усіх. Але ж цяжкая гэта справа! Калі Язэп цісьне: не друкуйце Юзіка, бо інакш вашую газэту чытаць ня буду, ды іншых адгавару. Юзік жа, вядома, патрабуе адваротнага. І ўсё гэта настойліва, ваяўніча, непрымірыма. Міжволі ўзгадваюцца нядаўнія, цэкоўскія часы, калі аднаго паэта вершы нельга было друкаваць, другога — нават імя ўспамінаць. Вельмі вас просім, шаноўныя нашы чытачы, паважайце нас таксама. Бо мы таксама маем права на ўласнае меркаваньне, асабістае і прафэсійнае. Апроч гэтага, наша роля ў тым, каб прыўзьняцца панад усялякімі звадкамі і каб хаця б паспрабаваць усіх вас згуртаваць. Вось часу мы друкуем сябраў БНФ, Грамады, вуніятаў і г. д. Калі ж станьма выконваць загады кожнага чытача (а кожны лічыць, што мае рацыю), дык нам давядзецца перасварыцца з усімі вамі й зусім спыніць выпуск «Пагоні».

З Новым годам, сябры! Жыве «Пагоня»!

Рэдактар.


● *Ліст у рэдакцыю*

Жыве Беларусь, але чым?!

Паважаная Рэдакцыя «Пагоні»!

Перш за ўсё хочацца павіншаваць Вас з няблага робленым часопісам. Нарэшце трапіла ў мае рукі некалькі нумароў «Пагоні», якія прачытаў з прыемнасьцю. Вядома, не без заўвагаў. Але, няма ідэальных зьдзяйсьненьняў.

Маючы нагоду напісаць Вам карэспандэнцыю, запынюся на праблеме капітальнага значэньня. Менавіта, на ролі друкаванага слова ў Беларускім Адраджэньні. Справа ня ў тым, што ўсяго адна на чатыры гэзэты ды часопісы ў Рэспубліцы Беларусь выдаецца цяпер раптам па-беларуску. Гэта ганьба Міністэрства інфармацыі і — шырэй — небеларускай улады Беларусі. Яна з часам будзе нацыянальнай, сваёй, роднай; каб толькі сама Беларуская Дзяржава пратрымалася. Даволі ёй аднаго пакаленьня — дваццаці гадоў — і ўжо станецца несьмяротнай. Што бачым на прыкладзе Летувы, якую выратавалі ад пагібелі ня столькі ксяндзы ды незразумелая расіякам мова, колькі якраз



тое міжваеннае незалежнае дваццацігоддзе. Памяць большага кавалка хлеба і невашывага існаваньня.

«Пагоня» мала паспрыяе Беларускаму Адраджэньню. Як і падобныя ёй часопісы ў Брэсьце, Віцебску, Гомелі, Баранавічах... Яны функцыянуюць у замкнутым коле інтэлігентнага чытача, якога ня трэба беларусізаваць, вяртаць ва ўлоньне Айчыны. Ён даўно патрыёт. Яму няма асаблівага сэнсу тлумачыць, што значыць быць беларусам.

«Пагоня» не канкурэнт «Гродненской правде», якая вырашае пра настрої вуліцы (параўнайце тыражы). У чым перавага тае другой над першай? Ухілюся тут пералічваць банальнасьці, шануючы інтэлігентнасьць чытача. Скажу пра галоўнае: «Гродненская правда» ёсьць тавар, прапанаваны кожнаму пакупніку, нават дэбільнаму. «Пагоня» ёсьць тавар, прапанаваны элітарнаму пакупніку, як быццам накшталт кліентуры «Бярозкі»... Купіць «Пагоню» асоба, падрыхтаваная духоўна, зацікаўленая вышэйшымі якасьцямі экзістэнцыі. Яна вымагае ад свайго чытача высілку, маршчыністых мазгоў, філасофії душы, а не жывата з кішкамі. Такіх у кожным грамадзтве мала; амэрыканскія сацыёлагі ацэньваюць іх сярэднюю колькасьць у 2-3 працэнты. Заўважце, як дакладна адпавядае гэтаму падліку тыраж «Пагоні» у параўнаньні з тыражом «Гродненской правды».

Так што «Пагоня» не павінна наракаць на маргінальнасьць сваю сярод чалавечай масы. Гэта норма. Больш таго: «Пагоня», праўдападобна, ёсьць сапраўды ворганам эліты субграмадзтва Гарадзеншчыны. І за гэта ёй вялікае брава!

Перавага «Гродненской правды» у тым, што яна дае інфармацыю. Грамадзкая слабасьць усякага часопіса, у іх ліку і «Пагоні», у тым, што канцэнтруецца на ідэі. Часопіс іначай ня можа. І газэта іначай ня можа, калі яна газэта.

З «Пагоні» Вы газэты ня зробіце, бо ня маеце за што друкаваць яе штодзень з раніцы. Дзеля гэтага трэба мець ня толькі капітал, акуратныя грошы, але і журналістаў (замест ідэёлагаў). Журналіст — гэта такі чалавек, які дзень і ноч ганяецца ў поце чала за істотнай інфармацыяй: што, дзе, калі?! «Гродненска правда» — гэта слабенькая газэта, на мяжы гібрыда з часопісам. Ня маючы канкурэнцыі, яе тыраж павінен перавышаць трыста тысячаў экзэмпляраў (у падобным на Горадню Беластоку выходзяць тры штодзёнкі і пяць ці шэсьць часопісаў, і амаль усе яны самафінансуюцца; газэтныя журналісты зарабляюць больш, чымсьці дырэктар сярэдняй вялічыні фабрыкі). Некаторыя ў Беластоку пачыналі сваё жыцьцё ў выглядзе шапіраграфных бюлетэняў; добра прадаваліся, зарабілі, перайшлі на нармальны друк.

Я яшчэ ня так «вэтэранны» каб не разумець, што лёгка крычаць і даваць мудрыя парады, пакідаючы рэалізацыю іх наіўным фраерам... Тым ня менш, спрабуйце заснаваць прэс-выдавецтва «Пагоня» з амбіцыяй на ўтварэньне штодзённай газэты. Тады Беларускае Адраджэньне кране тых, каго напраўду трэба адраджаць. «Пагоня» — «Пагоняю», але, напрыклад, без «Гродзенскіх навінаў» ня выпаўзьці Вам з супэр-беларускага катла на народныя прасторы. Вось так: рынак ідэяў і рынак інфармацыі — розныя рэчы.

Сакрат ЯНОВІЧ,
Беласток.

СА ЗЬЕЗДУ БСДГ

20 сьнежня ў Менску завяршыў работу другі зьезд Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Грамады. На працягу трох дзён 90 дэлегатаў, якія прадстаўлялі звыш дзьвюх тысяч сяброў БСДГ, заслухалі і абмеркавалі справаздачу цэнтральнай рады, прынялі шэраг рэзалюцый, у тым ліку па сацыяльна-эканамічнаму становішчу і вайсковым пытаньні. Былі прынятыя такія важныя дакумэнты як праграма партыі і новая рэдакцыя статута.

Адбыліся выбары кіруючых ворганаў Грамады: цэнтральнай рады і цэнтральнай кантрольна-рэвізыйнай камісіі. Таксама абраны старшыня цэнтральнай рады БСДГ і яго намесьнікі. Пераемнікам памерлага лідэра партыі М. Ткачова стаў народны дэпутат Рэспублікі Беларусь А. Трусаў, а адным зь яго намесьнікаў абраны старшыня Гарадзенскай філіі БСДГ М. Патрэба. Яшчэ адзін гарадзенец І. Рынкевіч узначаліў цэнтральную кантрольна-рэвізыйную камісію.

Г. СЫСОЙ,
сябра БСДГ.

★★★★★★★★★

Першы год незалежнасьці

На апошнім зьездзе БСДГ, які адбываўся ў сьнежні мінулага года ў Менску, Міхал Сьцяпанавіч Патрэба быў абраны намесьнікам старшыні Рады. З гэтае нагоды некалька пытаньняў яму задае карэспандэнт «Пагоні» М. Карневіч.

Найперш, Міхал Сьцяпанавіч, віншую вас з новай пасадай і жадаю плённай працы.

— Дзякую. Дарэчы, акрамя мяне з Горадні, старшынёй Кантрольна-рэвізійнай камісіі зьезда быў абраны Ігар Рынкевіч.

— *Міхал Сьцяпанавіч, вось ужо год, як Беларусь абвясьціла ўсяму сьвету аб сваёй незалежнасьці. Як вы можаце ахарактарызаваць гэты год?*

— Па-першае, назалежнасьць усё-такі ёсьць. Хоць яна пакуль яшчэ не зусім сапраўдная, не гарантаваная, але ўсё ж ёсьць.

Па-другое, мы маем сёньня бяздарны парламэнт і ўрад. Гэта значыць такі, які задавальняў бы БССР, а не сучасную Беларусь. Усё наша незадавальненьне гэтымі структурамі выклікана найперш тым, што нам трэба рухацца наперад да сапраўднай незалежнасьці. Хоць, з другога боку, гэты шлях ужо пачаты і невядома як яшчэ гэтую маруднасьць ацэніць гісторыя. Дзіўная толькі тое, што цягнучыся ў самым хвасьце ўсіх нашых суседзяў, мы ўсё ж такі паўтараем іх памылкі.

Падзеньне ўзроўню жыцьця нашага народа, як сьведчыць сітуацыя, будзе і надалей працягвацца. Паколькі мы ня маем самастойнага народнагаспадарчага комплексу, а шмат у чым залежым ад Расеі. Усё што адбываецца ў іх, пераносіцца на нас. Бадай адзінае, што магчыма зрабіць — гэта неяк зьмягчыць для народа гэтыя цяжкасьці.

Ні ўрад, ні парламэнт сягоньня ня хочуць прыслухоўвацца да апазіцыі, а гэта, дарэчы, ня горшая частка людзей, якія займаюцца зараз палітыкай.

Карацей, нічога суцяшальнага пасьля года незалежнасьці для жыцьця народа я пакуль ня бачу. Наперадзе яшчэ цяжэй.

— *Як у такой сітуацыі мяркуе паводзіць сябе Грамада?*

— На гэты конт мы выступаем з прапановамі да ўрада і парламэнта краіны сьмялей ажыўляць эканамічныя пераўтварэньні, зраўноўваць у правах усе формы ўласнасьці: прыватную, дзяржаўную, калектыўную. Гэта па-першае. Па-другое, патрэбна неадкладна мяняць сітуацыю ў сельскай гаспадарцы. Дарэчы, пры гэтым Грамада не выступае за разгон калгасаў, наадварот, мы падтрымліваем калектыўныя формы гаспадараньня, якія павінны вызначацца самімі сялянамі. Але мы самым рашучым чынам выступаем за прыватызацыю зямлі, бо яна толькі тады будзе па-сапраўднаму даглядацца, калі чалавек будзе ведаць, што ён пакіне гэты надзел у спадчыну сваім дзецям і ўнукам. Дарэчы, гэта вельмі актуальна для Заходняй Беларусі, дзе яшчэ жывуць людзі, якія памятаюць свае надзелы, адабраныя ў свой час ад іх прымусова.

— *Міхал Сьцяпанавіч, на сёньня вельмі важнае для Беларусі вайсковае пытаньне. На якіх пазіцыях зараз знаходзіцца ваша партыя?*

— Грамада адназначна выступае за ажыцьцяўленьне без ядзернага і нейтральнага статуса Беларусі. Дарэчы, Грамада была, бадай, адзінай з палітычных партый, якая выступіла ў Вярхоўным савеце супраць таго, што ў праэкце новай Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь быў не ўпісаны наш дзяржаўны статус, хоць у дэкларацыі «Аб незалежнасьці» гэта было.


Сябры Грамады першымі выступілі з ініцыятывай стварэньня Беларускага згуртаваньня вайскоўцаў, якое мае сваёй мэтай патрыятычнае выхаваньне ваеннаслужачых Беларусі. Дарэчы, дагэтуль сябры гэтага згуртаваньня ў дзеючым войску падвяргаюцца ганеньням. І сягоньня, на жаль, відаць, што армія, якая ў нас ствараецца, беларуская толькі па сваёй назве. Думаю, што сапраўднае беларускае войска зьявіцца тады, калі будзе сапраўдны беларускі ўрад і парламэнт.

— *Але, калі чакаць, што некалі зьменіцца гэты парламэнт, Вярхоўны Савет, то ці будзе ўвогуле ў Беларусі будучае?*

— Разумею ваша пытаньне. Неяк нядаўна я выступаў па вабласному тэлебачаньню. Да мяне пасьля гэтай перадачы было вельмі шмат званкоў. Тэлефанавалі большасьцю людзі, якія ўжо зараз ня здольны пракарміць сваю сям'ю, дзяцей. Я выслухваў іх і адчуваў, што знаходжуся ў ролі сьвятара. Праўда і яны ведалі, што я ім нічым дапамагчы не магу, а тэлефанавалі толькі дзеля таго, каб выказацца.

Дарэчы, сацыял-дэмакраты ў сваіх традыцыях заўсёды, калі не маглі зрабіць вялікага кроку, рабілі тое, што было магчыма. Скажам, тыя ж дзіцячыя садкі або калектыўныя сады і агароды ў Эўропе ў свой час зьявіліся з ідэй сацыял-дэмакратаў. Думаю, што і зараз бліжэйшымі крокамі будзе правядзеньне канкрэтнай дабрачыннасьці для людзей абездоленых. Канкрэтная дапамога сёньня вельмі патрэбна такім людзям.

— *Міхал Сьцяпанавіч, ці робіць якія-небудзь захады Грамада з іншымі прагрэсіўнымі партыямі па стварэньню кааліцыйнага ўраду?*



— Афіцыйна такіх крокаў пакуль не рабілася. Але спадзяюся, калі зьявіцца такая нагода, асаблівых цяжкасьцей з гэтым ня будзе.

У нашай партыі вялікі інтэлектуальны патэнцыял, і мы можам узяць на сябе частку адказнасьці ў будучым магчымым кааліцыйным урадзе, калі дакладна будуць акрэсьлены яго задачы: умацаваньне дзяржаўнай незалежнасьці Беларусі, правядзеньне эканамічных рэформаў, абароны чалавека працы, маламаёмасных слаёў насельніцтва.

— *І апошняе пытаньне. З чаго б пачала ваша партыя калі б зараз апынулася ва ўладзе?*

— Прынялі б закон «Аб прыватнай уласнасьці на зямлю і падтрымцы сельскай гаспадарцы».

Ураўнялі б у правах усе формы ўласнасьці, вызвалілі б ад падаткаў на першыя некалькі гадоў прыватныя прадпрыемствы, якія маюць выпускаць тавары народнага спажываньня.

Гарантавалі б замежным інвэстытарам іх уклады ў эканоміку Беларусі.

Распачалі б рэструктурызацыю народнай гаспадаркі, пачалі б асьцярожную прыватызацыю. Сапраўдную рэформу вышэйшай і сярэдняй школы. І многае іншае, пра што не хапіла б месца гаварыць на старонках газэты.

Дзякую за гутарку.

● *Рэпліка*

ЧАРГОВАЯ АБРЭВІЯТУРА?..

Нядаўна прачытаў у друку пра вынікі падпісной кампаніі ў Беларусі на першае паўгоддзе 1993 года. Што станоўчага? Гэта рост беларускамоўных і дзьвюхмоўных выданьняў. Страцілі сваіх чытачоў «Знамя юности», «Беларусская нива», «7 дней». Цікава, што апошнім часам менавіта рускамоўныя выданьні сталі трыбунай прапаганды антыбеларускасьці. Дастаткова ўзяць «7 дней» за 19 сьнежня 1992 года, дзе пад загалоўкам «Чемоданы собирать пока рановато» надрукавана размова з лідэрам Каардынацыйнага Камітэта С. Гайдукевічам, «яркая» зорка якога імкліва і рашуча ўзышла на палітычным небасхіле Беларусі. Што ж распавядаў карэспандэнту «7 дней» паэт і музыка, супрацоўнік Саўміна Беларусі?

Па-першае, ККНРБ сапраўды народны рух, у якім аб'ядноўваецца 15 арганізацый! — Адзін толькі пералік колькасьці сябраў уражвае: ПКБ — 30 тысяч, Фонд сацыяльнай абароны вайскоўцаў і саюз афіцэраў — 100 тысяч, саюз вэтэранаў — 100 тысяч... Калі верыць журналісту, то ўсе гэтыя арганізацыі палітычныя?!. Адчуваеце розьніцу ў назве і зьмесце? Цікава, што ж запісана ў статутах гэтых арганізацый? Менавіта клопат аб састарэлых і інвалідах ніяк ня можа весьціся без барацьбы за ўладу...

Па-другое, ККНРБ, аказваецца, цэрбэрам стаіць на ахове Рэспублікі ад дэмантажу яе ў нацыянальны Гулаг...

Па-трэцяе, С. Гайдукевіч хаця і сын палкоўніка КДБ, але сам да КДБ ня мае аніякага дачыненьня, бо ўсе чуткі пра яго цёплыя і цесныя сувязі з гэтай арганізацыяй — байкі...

Па-чацьвёртае, ён, як бачна з размовы, аптыміст, бо толькі такі чалавек можа зрабіць заяву: «На очередных выборах представители ККНДБ пройдут без проблем».

Ой, хлопцы, не кажыце гоп... І як упэўнены спадар Гайдукевіч, калі «нацыяналісты» прыйдуць да ўлады, то рэпрэсіі непазьбежны і шмат каму давядзецца зьбіраць чамадан. Калі разьвіваць гэтую думку, то ў краінах Балтыі махавік рэпрэсій павінен быў быць закручаны ўжо ва ўсю. Але дзе ж яны, гэтыя Гулагі? А мо годзе займацца палітычным ашуканствам, спадар Гайдукевіч? Ці не на сумленьні вашых «бязкрыўдных» камуністаў мільёны вязьняў Курапатаў, Салаўкоў, Калымы, Урала... Так і хочацца пры гэтым сказаць словамі Купалы: «Чаго вам хочацца, панове?».

Можа таго, каб на Беларусі назаўсёды засталася нацыя манкуртаў, каб духоўнае яднаньне ніколі не адбылося?

Дарэмна вы гэтага чакаеце, бо як казаў некалі Міхаіл Сяргеевіч — працэс пайшоў.

Веру і ведаю, што зямля пад белымі крыламі, наша векавая Бацькаўшчына ня зьнікае ў глыбіні стагоддзяў. Веру, што адвечная мара народа аб свабодзе, роўнасьці і справядлівасьці зьдзяйсьніцца і Беларусь зойме сваё належнае месца ў сусьветнай супольнасьці як дэмакратычная і прававая дзяржава.

А што датычыць ККНДБ — час пакажа, ці пойдзе народ за «народным» рухам.

Г. СЫСОЙ,
дэпутат Гарадзенскага гарсавета.

● *Гутаркі ў рэдакцыі*

«Нас рана сьпісваць у архіў гісторыі»

Мне, актывісту БНФ, робіцца брыдка, калі чую заявы накшталт: БНФ поўнасьцю скарыстаў свой палітычны рэсурс, і яму час у архіў гісторыі. Упэўнена ведаю, што так заўжды гаварылі непрыхільнікі беларушчыны. Менавіта ім, здраднікам роднага, і перашкаджае сучасны лідэр нашага нацыянальнага адраджэньня.

Як жа на самай справе цячэ штодзённае жыцьцё бэнэфаўцаў! Сваімі думкамі, меркаваньнямі дзеліцца з карэспандэнтам «Пагоні» старшыня Гарадзенскай рады БНФ спадар Кастусь Жынь.

— Спадар Кастусь, значыцца час падвесьці вынік!

— Безумоўна, сьнежань — час падліку плёну. З прыемнасьцю адзначу, БНФ ёсьць што падлічваць, аналізаваць, ёсьць над чым задумацца і асэнсаваць. Дзейнасьць нашай Гарадзенскай суполкі і ўвогуле БНФ я б падзяліў на некалькі неадназначных пэрыядаў. Былі інтэнсіўныя пэрыяды, было й зацішша. Пачаткам сёлетняй працы трэба лічыць утварэньне ініцыятыўнай групы па падрыхтоўцы ўсебеларускага рэфэрэндума. У Горадні намі было створана сваё ядро, у якое ўвайшлі ўсе дэмакратычна і прагрэсіўна настроеныя партыі, суполкі, рухі. Гэта БНФ, БСДГ, маладзёжнае згуртаваньне «Паходня», Саюз палякаў Беларусі.

— Як вялася падрыхтоўчая праца!

— Пасьля таго, як у Менску была зарэгістравана цэнтральнай выбарчай камісіяй рада па збору подпісаў, мы ў сакавіку ў Горадні і вобласьці ўтварылі ініцыятыўную групу з 17 чалавек.

— Шаноўны старшыня, ці былі складанасьці ў зборы подпісаў!

— З боку ўлад усялякімі шляхамі ствараліся перашкоды, каб толькі зьбэсьціць нашу працу. Вы ж памятаеце штучна створаную праблему зь пячаткай агульнага аддзела, дзесяткі год гэтая самая пячатка ставілася на дакумэнты і была законнай. Нам жа, завераныя агульным аддзелам падпісаныя аркушы не былі залічаны, сьмешна не тое, што ўлады адмовілі ў даверы свайму агульнаму аддзелу, а іхнія спадзеўкі, што ў ініцыятыўнай групы пасьля гэтага ня хопіць сілы, энтузіязму працягваць справу.

— Як Вас сустракалі ў хатах, кватэрах!

— Тыя трыццаць тры тысячы подпісаў, якія сабралі семнаццаць чалавек, сьведчаць аб высокім рэйтынгу БНФ і іншых дэмакратычных дэмплыняў. Пры падліку мы высьветлілі, што нас падтрымалі звыш 60% насельніцтва, да якога зьвярталіся ў час кампаніі. Лічба нас радуе і дае надзею.

— Ганебныя адносіны Вярхоўнага Савета да волі народа вядомыя, што будзе далей рабіць Народны Фронт!

— У такой барацьбе мы атрымоўваем карысны вопыт і вучымся. Адбыўся вось і Сойм Фронту, і дзеячы на месцах зразумелі, што без адпаведнай палітычнай і эканамічнай падрыхтоўкі канстытуцыйна зьмяніць уладу на Беларусі, тым болей яе ўтрымаць, немагчыма. Таму выпрацаваны адзін накірунак. Гэта — палітычная і эканамічная вучоба.

— Скажыце, якім шляхам!

— У БНФ многа навукоўцаў, інтэлігенцыі, якая на месцах праз тлумачальныя гутаркі можа прынесьці шмат карысных ведаў грамадзтву. Другі шлях — вучыцца вядзеньню дзяржаўнай палітыкі. У гэтым выпадку падрыхтоўка кадраў адбываецца пры дапамозе замежжа.

— Якія ў Вас існуюць замежныя сувязі!

— Іх ня шмат, але досыць, каб даць тэарэтычную падрыхтоўку. Добрыя сувязі зь вядомым «Інстытутам Крыбля» ў ЗША. Нас запрашаюць на курс лекцый парлямэнты Нямеччыны, Нідэрландаў. Час пакажа вынікі, але я ўпэўнены: пэрспэктыва за намі, бо ўжо вельмі яскрава бачны імгненьні народных выбраньнікаў узбагаціцца за кошт народа, дзяржавы. Такія захады не даюць будучыні. Багацець трэба, але не за кошт дзяржавы, а мы бачым, як намэнклатура прыхватызуе заводы, фабрыкі, дамы, лецішчы.

— Вы ведаеце прыклады!

— Так, я маю інфармацыю, але пакуль не ўдакладню яе, не жадаю раскрываць. Лепей давайце пачакаем і потым праз суд дакажам факты прысваеньня народнай маёмасьці намэнклатурай.

— Якім шляхам адбываецца выкрыцьцё падобных выпадкаў!

— У горадзе Горадні створаны камітэт па кантролю за прыватызацыяй, якая хоць і прыпынена ВС, але ціхенька адбываецца.

— Хто ўвайшоў у гэты камітэт!

— Прагрэсіўныя дэпутаты вабласнога і гарадзкога саветаў, актывісты БСДГ, БНФ. Мы засядаем у саюзе каапэратываў «Ліга» на вуліцы Савецкай штотыднёва. З прыемнасьцю чакаем наведвальнікаў, іх дапамогі, інфармацыі аб парушэньнях.

— Якія ў Вас пажаданьні дэмакратычным рухам Беларусі!

— Не драбіцца, а, аб'ядна ўшыся, перамагчы здрадніцкія сілы. Бо толькі тады мы зможам пабудаваць прававую, цывілізаваную эўрапэйскую дзяржаву Беларусь. Веру, што так і будзе. Нас вельмі рана сілы пэкабоўцаў — рэваншыстаў спрабуюць сьпісаць у архіў гісторыі.

Распытваў Г. АСТРОЎСКІ.



СУСТРЭЧЫ З ЛІДЭРАМ ГРАМАДЫ

У днях 28—29 сьнежня м. г. Горадню наведаў старшыня Цэнтральнай Рады БСДГ член беларускага парлямэнта А. Трусаў. Ён прыняў удзел у сходзе гарадзенскай філіі БСДГ, пазнаёміў грамадоўцаў з асноўнымі накірункамі дзейнасьці партыі на бліжэйшы час.

У памяшканьні факультэта беларускай філалогіі і культуры унівэрсітэта Я. Купалы адбылася сустрэча сп. Трусава з прадстаўнікамі дэмакратычных рухаў Горадні. Пасьля свайго выступленьня ён адказаў на шматлікія пытаньні.

Лідэр Грамады сустрэўся з кіраўніцтвам вабласных прафсаюзаў і старшынямі прафкамаў буйных прадпрыемстваў горада. Абмяркоўвалася пытаньне ўзаемадзеяньня Грамады і фэдэрацыі прафсаюзаў у сацыяльнай абароне працоўных.

Апошняя гутарка адбылася паміж сп. Трусавым і дырэктарамі гарадзенскіх школ. Яны гаварылі аб праблемах пераўтварэньня школ з савецкіх у беларускія.

А. С.

● *Сучасная статыстыка*

ШЫКОЎНЫЯ ШЛЮБЫ ГАРАДЗЕНСКІХ БЕСПРАЦОЎНЫХ

■

Якім бы цяжкім і складаным не здавалася наша жыцьцё, а людзі і надалей працягваюць нараджацца і паміраць, браць шлюб і скасоўваць яго. Так няхітра ўвесь час працягваецца чалавечае жыцьцё, так збудаваны наш сьвет незалежна ад таго, ёсьць мы ў ім, ці кагосьці сярод нас ужо няма.

За адзінаццаць месяцаў мінулага года ў Горадні нарадзілася 4029 дзетак, большасьць зь якіх атрымалі сваё пасьведчаньне аб нараджэньні ў Доме грамадзянскіх абрадаў — 1774. У Кастрычніцкім раёне зарэгістравана 1455 немаўлятак, ў Ленінскім раёне — толькі 800 дзяцей. Як і ў 1991 годзе, у Горадні болей нарадзілася хлопчыкаў, хоць чамусьці даўно прынята лічыць, што дзяўчат у горадзе значна больш. Да прыкладу, толькі ў Доме грамадзянскіх абрадаў за адзінаццаць месяцаў мінулага года ў горадзе зарэгістравана 930 хлопчыкаў і 854 дзяўчынкі. Для параўнаньня: ў 1991 ўсяго ў горадзе нарадзілася 4558 дзяцей, з якіх 2177 дзяўчынак і 2381 хлопчыкі.

■

Пры параўнаньні колькасьці шлюбаў за два апошнія гады, большасьць прыпадае на 1991 г. За адзінаццаць месяцаў іх было зарэгістравана 2882, а ў мінулым за такі ж пэрыяд толькі 2527. Большасьць маладых любяць рэгістраваць свой шлюб у Доме грамадзянскіх абрадаў. У мінулым годзе там пабраліся 1416 пар, а ў 1991 годзе — 1680. Дарэчы, скасавалі свае сем'і ў 1991 г.— 1045 разоў, у 1992—1016. Паўторна, як паказвае статыстыка, за мінулы год толькі ў Доме грамадзянскіх абрадаў часьцей бралі шлюб мужчыны —55 разоў, жанчыны — 45 і абодва пасьля няўдалага сямейнага жыцьця пабраліся 18 чалавек.

Самы вялікі працэнт шлюбаў сярод рабочых. Ён — 819, Яна — 643. Затым службоўцы: Ён — 250, Яна — 394. Студэнты спаборнічаюць з тымі, хто зараз «часова» не працуе. Сярод студэнтаў: Ён — 139, Яна — 138. Тыя, хто часова не працуе: Ён — 136, Яна — 80. Дарэчы, вясельлі часова не працуючых адметна выдзяляюцца сваім багацьцем. Як правіла, да загса яны па'язджаюць на шыкоўных лімузінах і акружэньне ў іх значна большае.

Адстаюць ад усіх у гэтым радку толькі навучэнцы (Ён — 28, Яна — 138) і вайкосўцы: Ён — 75, Яна — 3.

■

Што датычыць нацыянальнага складу будучых сем'яў, то за мінулы год у Доме грамадзянскіх абрадаў было зарэгістарвана 170 шлюбаў паміж беларусамі і палякамі. Беларусы і рускія — 134, палякі і рускія — 47 і, як сьведчыць статыстыка, найменш сыходзяцца яўрэі і палякі — толькі адзін шлюб.

Дарэчы, так павялося, што юнакі найчасьцей уступаюць у шлюб з 21 да 24 гадоў, дзяўчаты з 19 да 21 года. Апошнім часам не даводзіцца зьдзіўляцца шлюбам паміж навучэнцамі і школьнікамі сярэдніх школ.

Не навіна для гарадзенцаў і шлюбы з замежнымі грамадзянамі. За мінулы год у Доме грамадзянскіх абрадаў зарэгістраваны 24 такія пары. Як правіла, замуж бяруць беларусак часьцей грамадзяне суседняй Польшчы, праўда, ёсьць двох ліванцаў і адзін в'етнамец.

Урэшце заўважу, што ўсё гэта задавальненьне, маецца на ўвазе цырымонія шлюбу, каштуе і дагэтуль толькі 85 рублёў і яшчэ 15 — дзяржпадатку. Гэта значыць, што ўсё ж ажаніцца ў нашай краіне пакуль не накладна.

■

На жаль, памірае людзей у Горадні таксама шмат. За адзінаццаць месяцаў мінулага года ня стала 1724 чалавекі, а за 1991—1992.

Аднак так ці інакш жыцьцё на Беларусі пакуль працягваецца і за гэты час кожнаму чалавеку трэба пасьпець шмат акрамя таго як толькі нарадзіцца, ажаніцца і памерці...

М. М.

У ВАЙСКОВЫМ КЛЮБЕ

Ня будзе у нас нацыянальнага войска да таго часу, пакуль не зьявіцца ў армейскім асяродку павага да нашай беларускай гісторыі і культуры, ня будуць пашырацца веды пра беларускую літаратуру і мастацтва. Першы крок у гэтым напрамку зрабілі супрацоўнікі вабласной бібліятэкі імя Яўхіма Карскага. Яны правялі ў Горадні літаратурна-музычны вечар для воінаў першай беларускай механізаванай брыгады. Прысьвячаўся вечар 110-годдзю з дня нараджэньня Якуба Коласа.

Вядучыя,— Галіна Міхайлаўна Рыгілевіч і Ганна Іванаўна Кучарэнка,— расказалі пра жыцьцё і творчасьць выдатнага беларускага пісьменьніка.

Гучалі цудоўныя радкі з паэмы «Новая зямля», прайшла віктарына «Ці ведаем мы Коласа?». Так што ў сьценах вайсковага клуба бадай ці не ўпершыню прайшло такое мерапрыемства.

М. МІХАЙЛОВІЧ.

БУЛЬБА ПА ЦАНЕ КАВЫ

У камэрцыйным аддзеле унівэрсама «Брэст» прадаецца бульба «фры» у мяшэчках па 2,5 кг. Адзін каштуе 2.700 рублёў! Няцяжка падлічыць кошт 1 кг. Верагодна камэрсанты, якія прывезьлі з-за мяжы імпартовую бульбу, механічна пералічылі яе кошт у дойчмарках або далярах на рублі. Здаецца, лагічны крок, але... Але тамака, дзе «фры» прадаецца па 2 з нечым даляры за кг, заробкі ў людзей зусім не 10—20 даляраў як у нас з вамі.

Тым часам у горадзе прадаецца падобная ж бульба, сьвежа падсмажаная ў алеі. Малы пакет (250 грамаў) каштуе 35 рублёў, а вялікі — 50. Гарадзенскія фрыткі маглі б быць яшчэ таньнейшымі, аднак прывабныя пакецікі, у якіх прадаецца бульба, купляюцца ў летувісаў па чырвонцу. Карацей кажучы, свае фрыткі лепей стасуюцца да нашае кішэні.

А. С

● *Царкоўныя традыцыі*

Як трапіць у рай

Калі ўлюбёныя вучні Хрыста Пятро і Паўлюк спыталі яго, як пазбавіцца граха і зарабіць пашану ў Госпада Бога, Ісус Хрыстос адказаў: пастом і малітваю. З таго часу ўсе хрысьціянскія канфэсіі строга выконваюць гэтую запаведзь сына Божага. Сёньня «Пагоня» знаёміць чытачоў з традыцыямі посту праваслаўнай царквы.

Як вядома, у вернікаў праваслаўя існуюць чатыры галоўныя пасты.

Адметнае месца займае Вялікі пост, ён цягнецца сем тыдняў перад Вялікаднём. У гэтым посьце вернікам забараняецца слухаць рытмічную музыку, рабіць гулянкі, мовіць дрэнныя словы. Наадварот, неабходна дараваць здраду, сябраваць. Вялікі пост шчыры, у ім нельга есьці нават рыбу. Кожны з сямі тыдняў своеасаблівы. Першы тыдзень — гэта толькі шчыры пост. Вернік рыхтуе сябе да выпрабаваньняў на ўсе астатнія шэсьць тыдняў. Другі тыдзень — крыжапаклонны. Выносіцца на сярэдзіну сьвятога храма крыж. Вернікі каля крыжа ўспамінаюць мучэньні Хрыста, як бы далучаючы свае душы з мэтаю палегчыць цяжар выпрабаваньняў пастом. Трэці, чацьвёрты, пяты, шосты тыдзень — дараваньня. Людзі павінны дараваць адзін другому ўсё дрэннае. Тым самым ачысьціць душы ад чорнага перад самым асноўным тыднем посту.

Сёмы, страсны тыдзень, асноўны ў Вялікім посьце. Вернікі моляцца, кожны дзень ідуць у храм, рыхтуюцца да ўваскрэшання Ісуса Хрыста. Кожны дзень мае сваю адметную рысу, асабліва чацьвер, дзень таямнічай вячэры. У чацьвер забаронены пацалункі, бо, як вядома, Хрыста здрадзіў пацалунак. Некаторыя адданыя вернікі сёмы тыдзень п´юць толькі ваду, адмаўляюцца ад ежы.

Другі пост — Пятроў — цягнецца два, а калі і пяць тыдняў. Ён ня такі строгі, як Вялікі пост, але таксама праходзіць без мяса і малака. Пятроў пост не жалобны, вернікі моляцца дома і ў царкве аб сьвятым угодніку Пятру, замаўляюць пропаведзі. У паста ёсьць свая асаблівасьць. У народзе кажуць, што Бог даў на захаваньне Пятру ключы ад раю, і калі не маліцца Пятру ў посьце, то ён не адчыніць пасьля вашай сьмерці браму раю, і вы трапіце у пекла.

Трэці пост — Усьпенскі — цягнецца два тыдні. Гэты пост — як ухвала прысьвятой Багародзіцы Прыснадзевы Марыі. Ён шчыры й жалобны, па сваёй значнасьці дараўноўваецца да Вялікага паста. У гэтыя два тыдні павінны быць патрабальнымі да сябе цяжарныя жанчыны, ім неабходна наведваць храм Божы, маліцца, слухаць пропаведзі, ставіць сьвечкі.

Чацьвёрты пост — Нараджэньня Хрыста — цягнецца шэсьць тыдняў. Пост асноўны, але ня шчыры. У гэтым посьце вернікі рыхтуюцца да сустрэчы нараджэньня Выратавальніка — сына Божага Ісуса. Пяюць калядкі, нарыхтоўваюць прыпасы, каб з гонарам сустрэць дзень нараджэньня.

Акрамя вышэйназваных пастоў праваслаўныя вернікі на працягу года посьцяць два дні ў тыдзень: сераду — як дзень калі Хрыста арыштавалі, пачалі катаваць і зьдзекавацца, а таксама пятніцу — як жалобны дзень распяцьця Хрыста.

Г. АСТРОЎСКІ.

НЕПЭДАГАГІЧНАЯ ГІСТОРЫЯ

Заканчэньне

Загаловак добра вядомы сталым чытачам па папярэдніх публікацыях у восьмым і адзінаццатым нумарах «Пагоні». Гэтая сумная эпапея з жыцьця былога загадчыка РАНА Зэльвенскага райвыканкама М. Дз. Ярмоліка нарэшце закончылася 30 лістапада г.г. пасьпяхова. Народны суд Ваўкавыскага раёна аднавіў яго на месцы былой працы. Здаецца, усё скончылася, але старшыня Зэльвенскага райвыканкама не дапушчае яго ў службовы пакой...

Але ўсё па парадку. Пяць месяцаў і адзін дзень доўжыўся ўвесь працэс аднаўленьня на працы. Толькі на пяты дзень судовага слуханьня закончыўся разбор справы па грамадзянскаму спазыску былога загадчыка РАНА Зэльвенскага райвыканкама М. Дз. Ярмоліка аб аднаўленьні на рабоце да выканкама райсавета.

Трэцяе судовае паседжаньне пачыналася. Пракурор з Ваўкавыска Л. І. Дацкевіч забачыўшы жывую гаворку паміж адказчыкам, яго прадстаўнікамі і спазытчыкам наконт футбольнага матчу, прапанавала ўсё скончыць палюбоўна. Але яе прапанова выклікала ў зале цішыню і пераканала, што адказчык ня жадае паступацца сваімі прынцыпамі...

... У ходзе суда ўстаноўлена, што ўтвораная распараджэньнем райвыканкама ад 16 сакавіка 1992 года камісія ўстанавіла некаторыя недахопы ў школах, прышкольных інтэрнатах. Усё негатыўнае, нават тое, за што і ня можа несьці адказнасьць загадчык РАНА, пастаўлена яму ў віну, а ўсё пазытыўнае — у заслугу райвыканкама. Да таго ж выкрыўся і такі факт: за пралікі ў рабоце і г. д. (у тым жа стылі) загадчык аддзела зьняты з пасады, а А. Карпеяў, які адказвае за аддзел народнай адукацыі ў выканкаме, ня мае зусім заўваг, тым больш папярэджаньняў. Суд прыйшоў да высновы, што аб´яўленыя спагнаньні Ярмоліку рашэньнямі выканкама не асновaны на законе.

Як ужо ведае чытач з папярэдніх публікацый, у 1990 годзе сэсія раённага Савета народных дэпутатаў разглядала прапанову выканкама аб вызваленьні Ярмоліка ад займаемай пасады і не згадзілася з рашэньнем выканкама. Ігнаруючы Закон (!), выканкам зноў у кастрычніку 1992 года ўносіць адпаведнае пытаньне на сэсію. Апошняя рашыла пытыньне на карысьць выканкама. Чакальную пазіцыю заняў тут і пракурор раёна В. У. Ігнацік, які прысутнічаў на пасяджэньнях выканкама, калі пазбавілі пасады загадчыка РАНА. Толькі пасьля кастрычніцкай сэсіі, увачавідку пабачыўшы парушэньні парадку яе правядзеньня, пракурор раёна ўнёс пратэст у вабласны Савет народных дэпутатаў. Пратэст падтрыманы пракурорам вобласьці.

Згадзіцеся, падоўгу слухаць аб адных і тых жа недахопах, якія па некалькі разоў ставіліся адказчыкам у віну сп. Ярмоліку, сумна і нецікава. Бо прадстаўнік адказчыка ў даўжэзных расплывістых фразах стараўся нешта гаварыць, але выходзіла, што нічога канкрэтнага, а тым больш якіх-небудзь аргумэнтаў, няма. Такім вось чынам і быў звольнены Ярмолік... Справа непамерна зацягнулася, бо для работнікаў суда практыка савецкай работы-непрывычная сфэра.

У залу, дзе адбываліся пасяджэньні, часта заходзілі працаўнікі Ваўкавыскага РАНА. Іх цікавасьць можна зразумець. Яе ж і выказаў інспэктар РАНА: «чалавек сутыкнуўся са старой сістэмай і стаў нежаданым».

Аргумэнтавана выступілі сьведкі У. А. Гаўрон і У. П. Спорык, якія прыязджалі з камісіяй для экспэртнага вывучэньня работы аддзела народнай адукацыі...». І калі ахарактаразаваць работу РАНА праз прызму спраў у вобласьці, то справы ідуць добра. Аддзел, якім кіраваў М. Д. Ярмолік, выконваў свае функцыі...».

У адпаведнасьці з дзеючым заканадаўствам суд аднавіў Ярмоліка на пасадзе загадчыка РАНА райвыканкама. І рашыў спагнаць з Зэльвенскага райвыканкама на карысьць спазытчыка розьніцу ў заработку за час вымушанага прагула ў памеры 14 177 рублёў 70 капеек. З яго ж дзяржпошліну ў даход дзяржавы 1420 рублёў і 100 рублёў судовых расходаў на карысьць Ярмоліка.

Пяць месяцаў судзіўся Ярмолік з выканкамам райсавета, цяпер яны памяняліся месцамі — Дзянішчык рашыў абскардзіць рашэньне суда. Што ж, гэта Закон яму не забараняе.

Якім бы ня было рашэньне наступнага суда, я толькі прывяду характарыстыкі для параўнаньня дзвюх кандыдатур загадчыкаў. Якога чалавека прагналі, ў чытача, магчыма, склалася ўяўленьне па публікацыях. А каго ўзялі зэльвенскія ўлады і прызначылі на пасаду? Вось вытрымкі з характарыстыкі на Чартка Івана Ігнатавіча. Возьмем з апошняга месца працы, калі ён працаваў дырэктарам Пархімаўскай НСШ Бераставіцкага раёна: «Таварыш Чарток І. І. зьмяніўшы да гэтага два раёны вобласьці, працаваў у Пархімаўскай НСШ Бераставіцкага раёна з верасьня 1980 года па чэрвень 1991 года. Спачатку — намесьнікам дырэктара, а з 1 верасьня 1982 года — дырэктарам. За час работы зарэкамэндаваў сябе рэзкім і строгім, нават жорсткім адміністратарам. Членам калектыву не давяраў...». На маю думку, для загадчыка, як кіраўніка хопіць, адпаведная блізкая па духу і больш рэзкая прадстаўлена і Ваўкавыскім РАНА, дзе ён працаваў з 1977 па 1979 гады.

Гэта для роздуму...

П. ЖЭБРАК,
г. Ваўкавыск.

Ксёндз, які пасварыўся з касьцёлам

Яўген ДРЭВЭРМАН нарадзіўся ў 1940 годзе. Доктар тэалёгіі, ксёндз, філёзаф, псіхатэрапэўт. Да верасьня 1991 году выкладчык Вышэйшай каталіцкай тэалягічна-філязофскай школы ў Падэрборне, Усходняя Вэстфалія. Ад пэдагагічнай работы адхілены. Цяпер працуе ў сьвецкім унівэрсітэце ў Падэрборне. Аўтар васьмі кніжак па тэалёгіі й псіхааналізу, якія выдадзены агульным накладам больш 1 млн. паасобнікаў.

Касьцёл ня толькі забараніў кс. Дрэвэрману выкладаць у каталіцкіх школах, але нават прамаўляць з амбону, пагражае яму таксама пазбаўленьне сану — першы за сто гадоў выпадак у Германіі. Чаму й за што! Размову з кс. Дрэвэрманам надрукаваў варшаўскі месячнік «Канфрантацыі».

— У Польшчы, як у Германіі, цягнецца гарачая спрэчка пра забарону абортаў. Каталіцкі касьцёл катэгарычна за такую забарону. Касьцёл абвінавачвае вас, што вы сваімі выступленьнямі падрываеце аўтарытэт касьцёлу. У чым вашыя разыходжаньні?

— Таталітарны спосаб навязваньня грамадзтву ідэі забароны абортаў грунтуецца на перакананьні, што заўжды можна абсалютна правільна, разумна й аб´ектыўна вырашыць, што дабро, а што зло, што дазволена, а што не. І гэта перакананасьць вядзе да поўнага падаўленьня іншадумства! Калі цяпер за іншадумства адлучаюць ад касьцёлу, то заўтра тымі ж спосабамі пачне дзейнічаць дзяржава,— а касьцельны клір хоча менавіта гэтага! — і што... будуць «адлучаць» ад грамадзтва?!

Часам складаецца ўражаньне, што каталіцкі касьцёл, асабліва ў Польшчы, у якасьці новага татальнага сьветапогляду, новай ідэялёгіі мог бы заняць месца камуністычнай партыі — праз свае прэтэнзіі на абсалютную ісьціну, праз манаполію на ўстанаўленьне пісаных і няпісаных законаў, звычак, традыцыяў, якія да таго ж у абавязковым парадку пашыраліся б на вызнаўцаў іншай веры альбо няверуючых.

У выпадку з абортамі, на маю думку, у касьцёле запанаваў спосаб мысьлечэньня, які не адпавядае духу усёй сутнасьці хрысьціянства. Пазіцыя касьцёла абсалютна ня ўлічвае канкрэтнага чалавека — яго жыцьцёвай сітуацыі, яго матываў, яго здароўя, яго ўласнай волі, нарэшце! Касьцёл сьцьвярджае, што кожны аборт у кожных умовах — гэта ўсё роўна забойства. Але ж мноства жанчынаў трапляюць у такую сітуацыю не з уласнай волі! Якое касьцёл мае права вырашаць агулам, што ёсьць злачынства, а што не?! Якое ён мае права раўняць свае маральныя прынцыпы з юрыдычнымі, дзяржаўнымі законамі?

Мэта ў тым, каб паказаць людзям, што ўсе мы ходзім пад Богам, каб даць ім прабачэньне, аказаць міласэрнасьць... Вось сэнс і сутнасьць хрысьціянства.

Мае апанэнты кажуць, што вось у нас ёсьць споведзь і права адпушчэньня грахоў, што вось тут мы й аказваем міласэрнасьць... Атрымваецца так, што калі жанчына робіць аборт — то гэта грэх, а калі потым ксёндз ёй яго «адпускае», то праблема раптам перастае існаваць! Касьцёл павінен «адпускаць» такі «грэх» не пасьля, а перад тым, павінен быць разам са сваімі вернікамі, даваць ім ня страх, а сілу. Замест гэтага жыцьцё падзелена напалам: спачатку — грэх, потым — «прабачэньне». Так касьцёл усяго толькі хоча набыць аўтарытэт.

— Вы займаецеся ня толькі тэалёгіяй, але й псіхатэрапіяй. Здаецца, што гэтыя прафэсіі не сумяшчаюцца. Як вам такое ўдаецца?

— Пра гэта я пісаў цэлую кніжку «Клірыкі». Там я сьцьвярджаю, што ксяндзы змушаны рабіць тое, што загадвае ім касьцельны аўтарытэт. Гэта прыводзіць да дэфармацыі, да раздвойваньня душаў — чалавек разрываецца на дзьве палавіны. За апошнія гады нежанатыя, між іншым, ксяндзы ні чым другім не займаліся так доўга, так упарта й так ахвотна, як... абортамі! Дый увогуле маральнасьцю сэксу, сям´і, супрацьзачатачных сродкаў, цяпер вось абортамі. Гэтая вось поза абранасьці, свайго пасланства, гэтая вось «адзінаслушная» ісьціна з вуснаў біскупаў альбо нават самога папы прыводзіць да таго, што вернікаў застаецца менш і менш.

— Дарэчы, чаму касьцёл так цікавяць сэксуальныя справы?

— Можна растлумачыць гэтую цікавасьць тым, што нежанатыя клірыкі ні пра што іншае проста ня могуць думаць: як гэта было б добра мець жонку і г. д. Гэтаксама хворыя гавораць і думаюць толькі пра здароўе, а зьняволеныя пра свабоду ці бедныя пра грошы.

— Але хіба касьцёл пойдзе на тое, каб адмяніць цэлібат? Нядаўна кардынал Стэдынскі з Бэрліну заявіў, што з пытаньнем цэлібату яшчэ ня ўсё ясна... Ці гэта мог быць «пробны шар»?

— Можа. Але ж кардынал сказаў толькі тое, што й без яго ўсе даўно ведаюць: Хрыстос ня ўводзіў цэлібат, гэта зрабіў касьцёл, а таму касьцёл можа гэта перамяніць. Праблема ў тым, што цэлібат трэба разглядаць асобна ад іншых справаў. Зыгмунд Фрэйд меў рацыю, калі пісаў у 20-х гадах, што чалавек існуе паміж двух палюсоў: пачуцьцём айцоўства й полымем лібіда, а жанчыну ўспрымае бадай адначасова й як мадону, і як прастытутку. Гэтае сьцьвярджэньне абсалютна пацьверджана яшчэ раз касьцёлам. Цэлібат ксяндзоў і адначасова... культ Марыі, ідэялы маралі, дзе зусім выключаецца сэкс. Такім чынам, каб перацярпець цэлібат, трэба было б адмяніць сэксуальныя абмежаваньні... А цэлібат зьвязаны з рэальнай уладай і даўно зьвязаны — ад XI стагодзьдзя. Нельга яго аддзяліць ад строга-цэнтралізаванай касьцельнай іерархіі ды права распараджацца лёсам многіх людзей, якія стаяць на ніжніх прыступках.

— ... Калі вы ўступілі ў палеміку з касьцёлам, то атрымалі падтрымку многіх і многіх каталікоў. Ці гэта пачатак новай рэфармацыі?

— Не. Цьвяроза разважаючы, каталікі застаюцца ў касьцёле толькі з прычыны традыцыі, другіх сувязяў даўно няма...

— З прычыны прыгожых абрадаў?

— Так. Каляды, Вялікдзень, хрышчэньне, прысутнасьць ксяндза на пахаваньні — шмат ёсьць момантаў, дзе ў сутнасьць таго, што адбываецца, ніхто на самай справе ня верыць праз іх ірацыянальнасьць. Рэлігійнасьць падаўляючай большасьці каталікоў павярхоўная, спрошчаная да традыцыі, каранёў якой ніхто ня памятае...

Гэта мусіць зьмяніцца, інакш ад касьцёлу адлучацца лепшыя людзі, а потым сам касьцёл ператворыцца ў сэкту, якая здэмантуе цэлы нутраны сьвет чалавека, будзе прапагандаваць адначасова сваю місію ўсесусьветнага збаўцы, якога на практыцы ўжо ніхто ня будзе патрабаваць. Калі напрыканцы XX стагодзьдзя каталіцкі касьцёл адно й можа сказаць, што трэба павыкідаць прэзэрватывы й другія таму падобныя сродкі альбо забараніць пад страхам турмы аборты, то ўсё менш вернікаў трактуе яго як месца, дзе чалавек размаўляе з Богам, дзе ня толькі сьвятыя, але й грэшнікі прымаюцца як людзі...

Друкуецца са скарачэньнямі.

ВА ЎНІВЭРСІТЭЦЕ Я. КУПАЛЫ

Пачынаючы з 1988 года ў Гарадзенскім дзяржаўным унівэрсітэце імя Янкі Купалы кафэдрамі беларускай і расейскай моваў ладзяцца чытаньні, прысьвечаныя першаму беларускаму акадэміку, нашаму земляку — Яўхіму Карскаму. Апошнія чытаньні адбыліся ў сьнежні і былі самымі прадстаўнічымі. У Горадню зьехаліся навукоўцы з Масквы, Санкт-Пецярбурга, Вільні, Менску, Слуцка, Уфы, Кемерава, Бярэсьця і іншых гарадоў. Асноўнай тэмай чытаньняў гэтага года стала «Супастаўляльная граматыка беларускай і расейскай моваў», па якой выступалі ў большасьці навукоўцы з Горадні і Уфы.

Усе даклады былі выдадзены ў спэцыяльным зборніку, прысьвечанаму менавіта гэтым чытаньням, прычым, друкаваліся толькі тыя даклады, з якімі непасрэдна выступаў навуковец. Упершыню яны друкаваліся на мовах арыгіналаў з мэтай папулярызацыі гэтага мерапрыемства.

Вельмі прадстаўнічай на гэты раз была дэлегацыя з Бярэсьця. Большасьць дакладаў берасьцейскіх навукоўцаў тычылася тэмы вызначэньня мясцовых гаворак, у якіх адзначалася іх падабенства да ўкраінскіх, але аднадушна падкрэсьлівалася беларускае паходжаньне і прыналежнасьць.

Пад час чытаньняў прадавалася кніжка А. Цыхуна пра акадэміка Я. Карскага, якая была нядаўна выдадзена. Да ўсяго жадаючыя мелі магчымасьць узяць аўтограф у самога аўтара, які таксама выступіў перад навукоўцамі.

М. К.

Маю прапанову

ЗАЛАТЫ ЗАПАС МАЛЫМ КОШТАМ

Адкажыце мне, калі ласка, чаму ўрад Беларусі як мага хутчэй не робіць залатога запасу? Для гэтага наш час вельмі спрыяльны. Растлумачу. Усім вядома, што цяпер у крамах залатыя рэчы 585 пробы каштуюць у сярэднім ад 1500 да 2000 тысяч рублёў за 1 грам. А прымаюць тое ж самае золата толькі па 583 рублі за грам. Раней кошт продажу быў 50 рублёў, а куплялі за 32 рублі за грам. Розьніца была ўсяго 18 рублёў. У наш час розьніца ў некаторых выпадках дасягае 15 рублёў. Вядома, што ніякага сэнсу прадаваць золата дзяржаве няма.

Трэба, каб урад Беларусі, як мага хутчэй даў дазвол скупляць у грамадзян золата па кошту ад 1300 да 1400 рублёў за грам. Тады ў Беларусь паедуць здаваць золата з усіх краін СНД. У Беларусі застанецца золата, а людзі забяруць грошы. Калі б так зрабіць, то сапраўды ёсьць шанц забіць трох зайцоў. Пазбудземся нікому непатрэбных грошай, бо, як вядома, пры ўводзе сваёй валюты, Беларусь дамовілася здаць увесь астатак савецкіх грошай Расеі. Зробім уласны залаты запас, што павінна палегчыць увод сваёй валюты і не дазволіць, каб у далейшым пры сваіх грашах была вялікая інфляцыя.

С. БУДНІК.



Калядоўшчыкі



Фота А. УЛАДАСЕВІЧА.

Надзённыя пытаньні

Пра вясковыя ГЭС, вадзяныя млыны, а таксама пра цяжкія мэталы

АДНА са значных праблем, якая існуе сёньня для Беларусі, гэта праблема энэрганосьбітаў. Раней, да 60-ых гадоў, шмат дзе ў Беларусі былі пабудаваны і дзейнічалі малыя (магутнасьцю ад 20 да 200 квт.) гідраэлектрастанцыі і мноства вадзяных млыноў. Пазьней ад іх адмовіліся, таму што паўсюдна правялі лініі электраперадач і эксплуатаваць ГЭС стала эканамічна нявыгадна, паколькі электрычная энэргія каштавала капейкі. Менавіта з гэтай нагоды мясцовыя «гаспадары» пачалі разбураць ГЭС і вадзяныя млыны. На сёньняшні дзень амаль усё зьнішчана.

У 1991 годзе я зьвярнуўся з гэтым пытаньнем у Гарадзенскі аблвыканкам, адтуль накіравалі ў калгас «Чырвоны Кастрычнік» Астравецкага раёна і ўрэшце за свой кошт вырашыў зьездзіць на завод цяжкага машынабудаваньня ў Сызрань па тэхнічную дакумэнтацыю на нізканапорныя гідраўлічныя турбіны. Аднак, там мне ня вельмі пашэнціла, бо за гэтую паслугу тамтэйшыя спэцыялісты запрасілі 140 000 рублёў, якія мне асабіста нават ніколі і ня сьніліся. Агледзеўшы яшчэ раз астанкі Янаўскай ГЭС у калгасе «Чырвоны Кастрычнік», пераканаўся, што і калгасу аднаму такая справа не па сілах.

Урэшце надумаўся зьвярнуцца ў Менск, у «Белэнэргасеткапраэкт», дзе мне адказалі, што магчыма ў Беларусі запусьціць у работу дробныя ГЭС і вадзяныя млыны агульнай магутнасьцю да 30 МгВт, але бяда ў тым, што вельмі вялікія грошы вымагае гэта справа. Аднак, я пераканаены, што справа вартая, каб яе зачынаць. Па-першае,— гэта экалагічна-чыстая энэргія, падругое, вадасховішча можна выкарыстоўваць для развядзеньня рыбы, якой таксама няшмат на Беларусі. У трэціх, значна палепшыцца мікраклімат тых мясцоў, дзе будуць збудаваны і пачнуць працаваць вадзяныя млыны і ГЭС. У чацьвёртых, гэта будзе значнай і таннай падмогай для беларускага фэрмэрства, якое ўсё роўна рана ці позна адродзіцца на гэтай зямлі. У пятых, ня трэба будзе баяцца затапленьня вадой вялікіх плошчаў зямлі у зонах Чарнобыльскай бяды, бо вада хоць паволі, але пастаянна будзе змываць радыёактыўныя элемэнты ў ніжні б'еф ГЭС і млыноў, дзе абавязкова патрэбна будзе размясьціць фільтры для ўлаўліваньня гэтых элемэнтаў. Фільтры павінны нагадваць тыя, якімі карыстаюцца англічане для здабычы ўрану з марской вады. Да таго ж эканомія паліва складае дзевяць тонаў умоўнага паліва, якое не патрэбна будзе купляць і прывозіць з-за мяжы.

Вось такія перавагі мы можам мець, калі адновім былыя маленькія ГЭС і вадзяныя млыны. А паколькі я ўжо часткова закрануў пытаньні Чарнобыльскай бяды, то і на гэты конт прашу выслухаць мае прапановы.

ІСНУЮЦЬ наступныя рэальныя сродкі вывядзеньня цяжкіх элемэнтаў з глебы ў мясцінах з найбольшым радыёактыўным забруджаньнем. Адзін з мэтадаў я апісаў вышэй. Дадам толькі, што фільтры павінны рэгулярна ачышчацца ад радыёактыўнага бруду. Гэты бруд патрэбна будзе пускаць на перапрацоўку з мэтай атрыманьня з яго ўрану, торыю і плутонію, ці надзейна пахаваць.

Сутнасьць другога мэтаду заключаецца ў тым, што цяжкія мэталы знаходзяцца на паверхні глебы ў 2—3 см. Неабходна гэты слой, разам з цяжкімі мэталамі зьнімаць і адвозіць на перапрацоўку або захаваньне. Такія апэрацыі можна праводзіць пры дапамозе машынаў для падмятаньня вуліцаў або цэмэнтавозаў, у якіх выкарыстоўваюцца вакуумныя насосы. Што датычыць тых зямель, дзе па загаду бязглуздага кіраўніцтва гаралі і сеялі, шкодныя элемэнты знаходзяцца там на глыбіні 28—30 см. Пры дапамозе бульдозераў патрэбна здымаць увесь гэты слой і адвозіць на пахаваньне, а затым праводзіць рэкультывацыю глебы. Ці на працягу пяцішасьці гадоў вырошчваць на гэтых месцах сельгаскультуры, якія нам павінна падказаць сельскагаспадарчая акадэмія, і зьнішчаць іх. Толькі пасьля шасьці гадоў такой няўдзячнай працы большасьць цяжкіх элемэнтаў будзе выведзена з глебы. І на працягу 15—20 гадоў гэтыя глебы можна будзе выкарыстоўваць для атрыманьня насеньня збожжавых і зернебабовых культур, якімі праводзіць сяўбу па ўсёй рэспубліцы. На здароўі людзей гэта не адаб'ецца, а ўраджаі значна павысяцца.

Да пытаньня «дзе захоўваць радыёактыўныя адходы?» магу дадаць: на глыбіні 300 і болей мэтраў пад намі існуе ператок вады Сусьветнага акіяну, г. зн. воды з Балтыйскага мора паступова прасочваюцца да Чорнага мора. Хуткасьць іх, на мой погляд, да 20 м. у год. Дык вось, вялікай бяды ня будзе, калі ўсе радыёактыўныя астаткі разам з зямлёй, зарваным асфальтам дарог, разам са сплаваным лесам, пахаваць у выпрацаваных шахтах у Салігорску або на Украіне. Пасьля выпрацоўкі ўзарваць на глыбіні. Там паступова пад узьдзеяньнем салёнай вады і разбаўленых у ёй элемэнтаў цяжкія мэталы пяройдуць у хімічна-зьвязанае становішча. Пакуль яны пройдуць шлях да Чорнага мора, мінуць мільёны гадоў, а да таго часу яны пройдуць усе пэрыяды паўраспаду і стануць звыклым сьвінцом. З-за таго, што гэта цяжкія элемэнты, ня могуць мігравать уверх, да паверхні зямлі яны ня дойдуць. Страшэнныя для ўсяго жывога цэзій, цэрый і цырконій таксама пяройдуць у хімічна-звязанае становішча.

Па маіх падліках, каб ачысьціць ад радыёактыўных забруджаньняў землі Рэспублікі Беларусь на працягу 10 гадоў патрабуецца кожны год выдатковаўць на гэта па 18 млрд. даляраў пры ўмове пахаваньня адкідаў у шахтах Салігорска.

Інакш, калі і надалей нічога ня будзе рабіцца з ліквідацыяй Чарнобыльскай катастрофы, мы ўсе застанемся яе заложнікамі і наша будучае пакаленьне таксама.

М. ЯРМОЛЕНКА, рабочы завода «Хімвалакно».

Спартоўскі гарт

У РАСЕІ ЯК ДОМА

Працягваюць пераможнае шэсьце па лёдавых пляцоўках Расеі беларускія клюбы «Нёман» з Горадні і «Хімік» з Наваполацку. Перайграўшы па чарзе ў гасьцях яраслаўскі «Ярынтэркам» і чарапавецкі «Мэталург-2», беларускі дуэт дачасна забясьпечыў сабе магчымасьць гуляць у другім этапе адкрытага чэмпіянату Расеі, паказаўшы пры гэтым выдатны вынік.

«Нёман» у 28 гульнях зафіксаваў 21 перамогу, чатыры разы дзяліў ачкі, і толькі ў трох гульнях, ды і тое на старце, паспытаў горыч паражэньня. Гарадзенская каманда лідыруе, набраўшы 46 ачкоў з выдатнай розьніцай, закінутых і прапушчаных шайбаў 134:55.

Ідучы на другім месцы, Наваполацкі «Хімік» гуляе больш сьціпла: ў 31 гульні ён набраў 46 ачкоў як і «Нёман» закінуўшы 123 шайбы і прапусьціўшы у свае вароты 78.

Калі ў Расеі першы этап розыгрышу набліжаецца да заканчэньня, то ў Беларусі, свой нацыянальны чэмпіянат робіць першыя крокі.

Першынство, ў якім стартавалі 12 калектываў, разьбіты на дзьве падгрупы. Згуляны два туры, пасьля якіх лідэрства захапілі Менскі ШВСМ і Хімік-2 з Наваполацку.

Дарэчы Хімік, на старце нанёс два паражэньні гарадзенскаму Нёману-2 зь лікам 17:0 і 15:3 узяўшы тым самым рэванш за пройгрыш галоўнай камандзе.

ТУРНІР ПЕРШАГА МАЙСТРА

У зале цяжкай атлетыкі менскага спартыўнага комплексу «Спартак» прайшоў 17-ы па ліку мэмарыяльны турнір Я. В. Новікава па цяжкай атлетыцы. Упершыню спаборніцтвы прайшлі як у жаночым, так і ў мужчынскім разрадзе, у якіх прынялі ўдзел 100 маладых спартоўцаў з усіх вабласьцей рэспублікі. Турнір вызначальны тым, што на ім фіксуюцца нарматыўныя вынікі майстроў спорту. Дарэчы, алімпійскія чэмпіёны Аляксандр Курловіч і Леанід Тараненка таксама ўпершыню выканалі нарматыў майстра спорту на турніры Новікава.

Адметна адзначыць, што ў Беларусі побач з менскай і гарадзенскай школамі цяжкай атлетыкі зьявіліся яшчэ дзьве — віцебская і магілёўская. Менавіта віцябляне і магіляўчане задавалі рэй на гэтых спаборніцтвах, асабліва ў дзяўчат вызначыліся віцябляне С. Баханава і А. Фёдарава. У мужчын найбольш цікавая барацьба разгарнулася ў катэгорыі да 99 кг, дзе сабраліся самыя моцныя атлеты. З вынікам 335 кг тут перамог Ф. Магір. Яшчэ адзін менчук А. Марчанка ў вазе да 76 кг паказаў вынік майстра спорту, а ўсяго за гісторыю турніра 48 яго ўдзельнікаў атрымалі гэтае ганаровае званьне, іх трое на сёлетнім турніры.

Ў СЛАВЭНІІ

Выдатна распачалі сэзон беларускія біятланісты. У Славэніі, на першым этапе кубка Эўропы, які праходзіць у камандным і асабістым заліку, нашы хлопцы стартавалі на стаэрскай дваццацікіламэтроўцы і ў спрынце. Ня было роўных Вадзіму Сашуры зь Менску на самай доўгай дыстанцыі яго партнёр па зброі, В. Хахракоў, тут быў другім. Вызначыўся ў спрынце і Алег Рыжанкоў, ён дабіўся бронзы.

Паралельна мужчынскім спаборніцтвам стартавалі жаночыя зборні. Вынік беларускіх страляючых лыжніц больш сьціплы, толькі другое месца Сьвятланы Шарамыгінай ў гонцы на 7,5 кіламэтраў, але гэта толькі пачатак, наперадзе яшчэ шмат этапаў, на якіх беларусы змогуць адыйграць страты.

НА ПАМОСТАХ РЫГІ

Удалым для беларускіх спартоўцаў — гіравікоў стаў памост рыжскага палацу цяжкай атлетыкі. Тут упершыню наша зборня выступала асобнай камандай на першынстве кантынента. Дэбют атрымаўся: другое месца ў камандным заліку, ўсьлед за расейскімі волатамі.

Прыемна адзначыць, што нашы хлопцы абыйшлі такіх грандаў гіравога спорту як зборні Балгарыі, Нямеччыны, Украіны.

Дарэчы, усе нашы спартоўцы, а іх было шэсьць, вярнуліся дамоў з мэдалямі рознага гатунку.

«РЫТМ» ПАЧЫНАЕ МІРНА

У плане падрыхтоўкі да надыходзяча сэзону летнія хакэісткі Гарадзенскага «Рытму», як заўжды сваім ходам, выязджалі да Нямеччыны на перадНавагодні турнір па міні-хакэю. «Рытм» правёў шэсьць гульняў у горадзе Эйнтрахце з аднайменным жаночым клюбам.

Гульні праходзілі па правілам нямецкай фэдэрацыі міні-хакэю і закончыліся мірна: у трох лепш згулялі госьці, а ў трох перамаглі гаспадыні.

Г. НЕМАН.

Віктар Шалкевіч піша брудныя беларускія блюзы і марыць аб грамадзянстве Вялікага княства Літоўскага

— Няўлоўны, шчыры, нечаканы, іранічны, непрадказальны, крыху псыхадэлічны, бацька бруднага беларускага блюза. Гэта ўсё гаворыць пра беларускага барда Віктара Шалкевіча. Што я яшчэ не сказаў пра цябе, Віктар!

— Бацька бруднага беларускага блюза — гэта галоўнае. Але што тычыцца ўсяго астатняга, то ты таксама маеш рацыю,— такі ўжо я ёсьць.

— Калі Віктар Шалкевіч стаў у гэтым жыцьці бардам!

— Быў час, калі я пачаў тварыць маладую беларускую літаратуру, і аднойчы прыйшло разуменьне таго, што мае творы, як дарэчы і творы большасьці беларускамоўных літаратараў, амаль ніхто ня будзе чытаць. Я, як кожны нармальны творчы чалавек, захацеў хутчэй дайсьці да чытача, таму й пачаў займацца песьнямі. Гэта адбылося тры гады таму на першым «Басовішчы», дзе я і выдумаў сабе такі тэрмін — бацька бруднага беларускага блюза.

— Тое, як ты сам сябе называеш, азначае, што ты сядаеш за брудны стол, бярэш бруднымі рукамі брудную асадку і на бруднай паперы пішаш свае вершы, якія потым выконваеш пад акампанэмент бруднай гітары!

— Дзякуй за пытаньне. Ёсьць шмат людзей, якія могуць гэты тэрмін зразумець і так. Па-першае, блюз — ад слова блуе, бо мае песьні крыху смутныя. Беларускі — таму што ўвесь час сьпяваю пра беларускія справы, а брудны — таму што жыцьцё наша сапраўды нейкае бруднае, і яно дае пэўны адбітак на песьні, а яшчэ, магчыма, брудны, таму што ў мяне рэзкаватыя тэксты.

— Некаторыя з тваіх слухачоў гавораць, што ты злы чалавек:

— Я лічу, што злы — гэта той, хто сьпявае прыкладна так: «Людзі, вы ўсе гады, я вас ненавіджу...» У маіх песьнях пэўны элемент Іроніі, які нярэдка і бянтэжыць тых, хто слухае мяне. Можа пры нейкіх абставінах я і бываю злым, але ў мяне няма адкрытай паталагічнай злосьці.

— У адным са сваіх інтэрв'ю ты заўважыў, што тваім галоўным прынцыпам у творчасьці зьяўляецца самаіронія. Як ты лічыш, гэта адбіваецца на адносінах людзей да цябе!

— Ведаеш, у большасьці выпадкаў гэта мне перашкаджае. Напрыклад, у пэўнай часткі беларускіх адраджэнцаў мая песьня «Добрай раніцы, жлобская нацыя!» выклікала такое абурэньне, якога я не чакаў. Мне казалі «Ды як ты мог, гэта зьдзек над нашым добрым народам». Тое ж самае было і зь песьняй «Зайграе наш пастух Аўлас, то не дакажа «Мроя» і «Мясцовы час». Нехта гэтага не зразумеў, а прыкладам мог быць артыкул у беластоцкім «Часопісе», калі Дарота Кузьміч мэнчыла мяне паўтары гадзіны, але выказала думку, што беларуская моладзь усё роўна больш любіць хлопцаў з «Мроі» і «Мясцовага часу», чым пастуха Аўласа.

— З гэтае нагоды, улічваючы, што людзей, якія не дазваляюць сабе асаблівай раскошы думаць, у нас ня так мала, то прапаную табе такую сітуацыю. Блюзмэн Шалкевіч усю ноч сядзіць з гітарай, ствараe свае неўміручыя творы, нарэшце на досьвітку, стамлёны, кладзецца адпачыць. Праз пэўны час ён прачынаецца, адчыняе вакно і голасна вітае Горадню: «Добрай раніцы, жлобская нацыя!» Прадстаўнікі гэтай нацыі, што знаходзіліся ў гэты час непадалёку, гуртуюцца, рашуча накіроўваюцца да барда Шалкевіча і задаюць яму пытаньне: «Как ты пасьмел!» Трэба нешта адказваць.

— Справа ў тым, што як «любовь нечаянно нагрянет», так і думкі прыходзяць нечакана, і не спадзяешся, што яны зьявяцца ў такім выглядзе. Ішоў



я неяк па вуліцы і мне ў галаву прыйшлі радкі:

Добрай раніцы, жлобская нацыя! Сонца ўзыходзіць лупатае.

Добрай раніцы, жлобская нацыя! Ніхто дурную ня сватае.

Песьня напісалася абсалютна падсьвядома, і потым ужо я паспрабаваў растлумачыць сабе, чаму яна зьявілася. Сапраўды, мне неяк крыўдна за тое, што робіцца з намі. Людзі страцілі сваю шляхетнасць, высакароднасьць у поўным сэнсе гэтых словаў. І я хацеў бы, каб яны зазірнулі сабе ў душу. Безумоўна, гэтыя словы ня ўсім даспадобы, але ёсьць шмат людзей, якія мяне разумеюць. У гэтым увесь сэнс і песьня ў першую чаргу для іх.

— А як ты ўвогуле ставішся да палітыкі!

— Калі я яшчэ жыў у інтэрнаце, то хадзіў па аплоце савецкага мілітарызму ў Горадні Фолюшу і расклейваў лістоўкі за Ткачова. Потым я падтрымліваў Мілінкевіча, калі той балатаваўся ў народныя дэпутаты. Але я не імкнуся жыць палітыкай, бо, урэшце рэшт, гэта брудная справа. Я ведаю, што ад мяне як ад простага чалавека залежыць сумленна жыць і меней красьці.

— Аднойчы, калі ў цябе запыталі, кім ты сябе лічыш, ты адказаў: «Грамадзянінам Вялікага княства Літоўскага». Гэта даніна той самай шляхетнасьці ці штосьці іншае!

— Зараз мы тут, на нашай зямлі, пачалі дзяліцца на палешукоў, заходнікаў, усходнікаў. Гэта, безумоўна, штучны падзел. Узгадайце, была адна вялікая нацыя — ліцьвіны, а там ужо разьбірайцеся, хто праваслаўны, хто каталік, а хто вуніят. Я за Вялкае княства Літоўскае ў межах XV стагодзьдзя. Я за вялікакняскі пасад. Пакуль што сталіца часова перанесена ў Горадню, бо Вільня знаходзіцца на тэрыторыі суседняй дзяржавы. Але думаю, што нешта зьменіцца, і знойдзецца нават кандыдат на Вялікага Князя.

— І кім бачыць сябе Віктар Шалкевіч у ВкЛ! Як ты наконт канцлера!

— Я б хацеў быць простым грамадзянінам.

— Пад час апошняга «Басовішча» ты выказаў думку, якая шмат каго зьдзівіла і нават абурыла: «Няхай жыве музычная сталіца Беларусі — Горадня!»

— Чаму Горадня — музычная сталіца Беларусі? Таму што, па-першае, у Горадні нядаўна адрадзілся Тызэнгаўз-капэла, якая проста выдатна запісала «Магутны Божа». Бандарэнка зрабіў такую шыкоўную апрацоўку, якую нельга ні з чым параўнаць. Па-другое, Горадня — гэта горад, у якім заўжды нешта адбываецца. То джаз прыязджае, то фэсты нейкія, і гэта, заўваж, заўсёды робіцца падзеяй, заўсёды ў людзей сапраўднае адчуваньне сьвята. А па-трэцяе, у Горадні жыву я — бацька бруднага беларускага блюза.

— Хачу каб ты, як чалавек, які займаецца беларускай бардаўскай песьняй, жыве непасрэдна гэтым, распавёў крыху пра яе сучасны стан.

— Тады з самага пачатку. А пачынальнікам быў Сяржук Сокалаў-Воюш. Гэта было класна, але Сяржук шчыра казаў, што піша ён пад Высоцкага і, калі хто-небудзь забярэ ў яго першынство, то ён сам адыдзе ад гэтае справы. Ён адышоў, але адышоў крыху пазьней, чым трэба было б. Гэта было прыкметна ўжо на другім «Басовішчы», калі ён не прывёз ніводнай новай песьні. Але быў, дзякуй богу, пачатак. На першым жа «Басе» мяне проста ўразіў Алесь Камоцкі, які стаў сапраўднай зьявай у бардаўскай песьні. Ёсьць яшчэ некалькі цікавых выканаўцаў. Але я хачу сказаць вось аб чым. У нашай самадзейнай песьні існуе нейкая занудная плынь, галоўныя тэмы якой — няшчасная беларуская мова, няшчасная беларуская культура, Чарнобыль нас пабіў і маскалі душаць. А дзе нармальная глыбокая інтымная лірыка, дзе астатняе жыцьцё? Трэба шукаць нешта новае, знаходзіць незапоўненыя нішы. Гэта вядзе да самавыраджэньня. Трэба працаваць на пэрспэктыву. Мяне бадзёрыць тое, што я на бардаўскай песьні ўжо пачаў зарабляць грошы. Значыць, у гэтым ёсьць сэнс. А тым, хто толькі ўваходзіць у бардаўскую песьню, кажу: хлопцы, выберыце сабе адметную тэму, бярыце свой гэктар поля і працуйце на ім, не залазячы на суседзкі, бо гэта будзе ўжо не цікава.

— Ты казаў, што на бардаўскай песьні пачаў зарабляць грошы. Дык што ж зараз робіць Шалкевіч-мэнэджэр!

— Я ў сапраўдным сэнсе не зьяўляюся мэнэджэрам. Магу зрабіць прыемную справу каму пажадаеш, а сябе прадаваць не магу, таму гэтым займаюцца іншыя. А ўвогуле мы правялі фэст «Губэрталіі альбо калядныя сустрэчы пры каралеўскім тракце». Крыху раней я даў два канцэрты пры поўнай залі ў Бельску-Падляшскім і тры канцэрты ў Магілёве. А хутка зьбіраюся ехаць у Гайнаўку і ў Віцебск, дзе мяне ўсе вельмі чакаюць.

— Скажы, калі ласка, як ты лічыш, чаму ты такі папулярны ў Польшы!

— Я гэта тлумачу тым, што заўжды сумленна стаўлюся да сваіх абавязкаў. Кожны год, калі я прыязджаю на «Басовішча», я прывожу з сабою новую праграму. Да таго ж, якія б лініі Керзона нас не падзялялі, мы ўсе жывём у адной дзяржаве — Вялікім княстве Літоўскім і зьяўляемся адным народам, якія б мы не былі зацятыя каталікі ці зацятыя праваслаўныя. Тое, што я сьпяваю, гэта не толькі ў Польшчы зразумела, але і ў Магілёве, і ў Менску. І што ж я магу зрабіць, калі мяне часьцей клічуць у Польшчу, чым у нашу сталіцу. Я польскім беларусам больш патрэбны, але ня трэба мяне за гэта дакараць. А посьпех... Трэба не лянавацца працаваць і паважаць свайго слухача: выходзіць на сцэну не пьяным, у сьвежых шкарпэтках і чыстым абутку. І мець галаву на плячох.

— У кожнага творчага чалавека ёсьць свой галоўны прынцып творчасьці. Ці ёсьць у цябе праграмная песьня і праграмныя радкі!

— Кажучы шчыра, у мяне некалькі праграмных песьняў, але самая галоўная, безумоўна, «Правінцыя». А другая — «Калі я стаміўся гаварыць тыя самыя словы»:

Вуліца, поле, Вялікае княства, жаўрукі ў паветры зьвіняць.

Вольнаму воля — найвялікшае шчасьце. Нават вецер не дагоніць каня.

А прынцып?.. Не забываць, што ты выйшаў з тае самае правінцыі, дбаць, каб тое лепшае, што было, яно вярнулася. Я маю на ўвазе ВкЛ. Прабачце мяне, беларускія нацыяналісты.

— Я ўжо бачу, што як Лімонаў змагаецца за Савецкі Саюз, так і ты выступаеш за ВкЛ.

— Папрашу без паралеляў і мэрыдыянаў.

— Ці ёсьць у цябе любімыя перадачы на беларускім тэлебачаньні і радыё!

— Я некалі сам працаваў на радыё і ведаю, што гэта такое. Таму па-просту не слухаю радыё і не гляджу тэлебачаньне.

— Калі ў Горадню прыедзе чалавек, які робіць першыя крокі ў бардаўскай песьні і выражыць, каб яго паслухаў і штосьці яму параіў беларускі бардаўскі «монстр» Шалкевіч, то дзе гэтага «монстра» трэба шукаць!

— Маё любімае месца — мая праца, а працую я ў Гарадзенскім лялечным тэатры. А другое маё месца — гэта мая хата, мая канапа, на якой ляжыць мой любімы кот Нігра і мая гітара. Прашу заўважыць, любімых кабакоў у мяне няма.

— Віктар Шалкевіч многім людзям вядомы яшчэ як вельмі здатны анэкдотчык. Будзь чалавекам, раскажы што-небудзь цікавае.

— На табе!

Было гэта пад час уздыму пралетарыяту і сялянства, калі ў Краіне ўладарыў Мікіта Сяргеевіч. У калгасе «Ленінскі шлях» ідзе справаздачна-выбарчы сход. Інструктар райкама заклікае калгасьнікаў:

— Таварышы, у наступным годзе мы павінны дагнаць і перагнаць ЗША па надоях малака на душу насельніцтва. Ура, таварышы!

Усе:

— Ура!

Адзін дзядок сядзіць і гаворыць:

— Дагнаць, канечне, можна, але пераганяць ня трэба.

Інструктар працягвае:

— Таварышы, у наступным годзе мы павінны дагнаць і перагнаць ЗША па вытворчасьці электраэнэргіі на душу насельніцтва. Ура, таварышы!

Усе:

— Ура!

Той жа дзядок:

— Дагнаць, канечне, можна, але пераганяць ня трэба.

І так гэты дзядок назоліў інструктару, што той, разьюшаны, пытаецца:

— Чаму, ну чаму, дзед?

— Таму што ня файна з парванай с... наперадзе бегчы.

— Дзякуй за паказку і за размову наогул. Посьпехаў табе.

У рэдакцыі «Пагоні» з Віктарам Шалкевічам гутарыў Сяргей Лаўнік.

ПАДЗЕІ

МУЗЭЙ АКАДЭМІКА АСТРОЎСКАГА

У Гарадзенскім інстытуце біяхіміі Акадэміі навук Беларусі 28 сьнежня адбылася навуковая канфэрэнцыя, прысьвечаная памяці акадэміка Ю. М. Астроўскага. З жыцьцём і навуковай дзейнасьцю акадэміка пазнаёміў прысутных дырэктар інстытута Ф. С. Ларын. Вучоныя інстытута біяхіміі і мэдінстытута прачыталі некалькі навуковых дакладаў, прысьвечаных разьвіцьцю біяхімічнай навукі ў Горадні і ролі ў ім Ю. М. Астроўскага, а таксама — надзённым праблемам прафілактыкі і лячэньня вітаміннымі прэпаратамі хворых ва ўмовах уплыву на чалавечы арганізм радыёнуклідаў. Прысутныя ўшанавалі памяць акадэміка хвілінай маўчаньня.

Пасьля канфэрэнцыі навукоўцы наведалі працоўны габінэт Ю. М. Астроўскага, у якім створаны мэмарыяльны пакой. З экспазіцыяй, падрыхтаванай сям'ёй нябожчыка і супрацоўнікамі інстытута, пазнаёміў намесьнік дырэктара інстытута біяхіміі А. Г. Майсяёнак. Апроч навуковай літаратуры і друкаваных прац акадэміка тут мноства фотаздымкаў, дакумэнтаў, рукапісаў, мастацкіх кніг. Аказалася, што Юрый Міхайлавіч ня толькі быў прыязны з літаратарамі, але сам пісаў вершы па-беларуску. У габінэце стаіць бюст Адама Міцкевіча, творы паэта ў арыгінале, тамы, прысьвечаныя Францішку Скарыну, Мікалаю Каперніку. На стале, на якім нічога не зьмянялі пасьля сьмерці гаспадара, ляжыць «Сказ пра Лысую гару». У шафцы — кубак, з якога ён піў каву. Прысутныя яшчэ паўней змаглі ўявіць глыбіню асобы Ю. М. Астроўскага: вядомага ў сьвеце вучонага, добрага чалавека і сапраўднага беларускага патрыёта.

С. А.

Навіны гандлю

ПРАДАЮЦЦА БЕЛ-ЧЫРВОНА-БЕЛЫЯ

У ВАШЫНГТОНЕ

Як паведамляе Нова-Ерскі «Беларус», «На галоўным чыгуначным вакзале ў Вашынгтоне... можна купіць памяткавую кашулю са сьцягамі сьвету, у тым ліку й бел-чырвона-белым з подпісам БЕЛАРУСЬ (лацінкаю), а таксама нагрудны значок у форме двух спалучаных сьцягоў — амэрыканскага й беларускага».

У ГОРАДНІ

З крамных вітрынаў яшчэ ўлетку зьніклі апошнія вымпелы з надпісам «Планы партии — планы народа», яшчэ раней ня стала сьцягоў БССР. Аднак бел-чырвона-белыя зрабілася магчымым набыць недзе толькі ў першыя ўгодкі СНД. Малы каштуе 84 рублі, а большы сьцяг — 234. Прадаюцца яны ў канцылярскіх аддзелах, у прыватнасьці ва універмазе.

С. А.

Трыумф «Князя Навагрдскага»

на сцэне Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі,— важнейшая падзея культурнага жыцьця ў сьнежні. Так ацанілі крытыкі і гледачы прэм'еру оперы гарадзенскага кампазітара Андрэя Бандарэнкі. «Трыумф»,— у перакладзе з лацінскай азначае выдатны, бліскучы посьпех. Посьпех «Князя Навагрдскага» ня стаў асаблівай нечаканасьцю для тых, хто знаёмы з творчасьцю А. Бандарэнкі. Гэта заканамерны вынік творчага росту, сьведчаньне сталасьці.

Тэма оперы,— зараджэньне і умацаваньне Вялікага Княства Літоўскага са сталіцай у Навагрдку, вытокі беларускай дзяржаўнасьці. Рэальныя дзеючыя асобы,— вялікі князь Міндоўг, ягоны сын Войшалк, манах Ялісей... Сутыкненьне характараў, асабістая драма гэроаў. Гэта ўсё дало багацейшы матэрыял кампазітару для стварэньня нацыянальнай эпічнай оперы. Галоўная думка спэктакля: сапраўдныя адносіны паміж людзьмі заснаваны толькі на любові, на чалавечнасьці.

— Я не чакаў, што будзе такі посьпех,— гаворыць Андрэй Бандарэнка. Прэм'ера прайшла з уздымам, пастаноўку занісалі для Беларускага радыё. Вядома, што прэм'ера,— перш за ўсё нейкае адкрыцьцё і першае ўражаньне вельмі важнае. Яно дае стымул далейшаму жыцьцю спэктакля».

Цяпер «Князь Навагрдскі» будзе ісьці на менскай сцэне кожны месяц,— і ў студзені, і ў лютым. А ў красавіку спэктакль будзе прадстаўлены на фэстывалі музычна-тэатральнага мастацтва Беларусі, які пройдзе у Менску. Так што спэктакль жыве ўжо самастойным жыцьцём, уплывае на тэатральны працэс у рэспубліцы.

Андрэй Бандарэнка шчыра ўдзячны Міністэрству культуры РБ, якое стала ініцыятарам гэтай пастаноўкі. Для работы над операй былі сабраны лепшыя сілы. Лібрэта па п'есе Леаніда Пракопчыка напісала Вольга Іпатава, вельмі плённа працавалі рэжысёр-пастаноўшчык Сямён Штэйн, сцэнограф Дзьмітрый Мохаў, дырыжор Мікалай Калядка. Велізарную ролю адыграў у оперы хор. Цудоўна выступілі ў пастаноўцы «Князя Навагрдскага» акцёры М. Маісеенка, У. Экнадзіёсаў, Н. Кастэнка, Я. Пятроў...

М. ПЯТРОЎСКІ.

ВУНІЯ ВЯРТАЕЦЦА...

Як вядома, ніводная з канфэсій не падлягала на Беларусі такім страшным нападкам, як вуніяцкая. У 1839 годзе расейскім царом вуніяцтва было ўвогуле забаронена. Беларускі народ быў пазбаўлены магчымасьці зьвяртацца да Бога на сваёй роднай мове. Дарэчы, на той час, больш за 70% насельніцтва Беларусі былі вуніятамі, г. зн. што амаль кожны з нас, чые карані паходзяць з беларускай зямлі, меў продкаў вуніятаў, пра якіх мы, на жаль, нічога зараз ня ведаем. Вуніяцтва было вельмі натуральным для нашага народа, так як мы знаходзімся на мяжы паміж каталіцтвам і праваслаўем.

26 сьнежня ў Горадні ў зале Дома народнай творчасьці ладзіла сваю прэзэнтацыю грэка-каталіцкая суполка, якая была зарэгістравана ў красавіку 1991 года. Як паведаміў у сваёй прамове вуніяцкі сьвятар айцец Віктар, усяго на Беларусі зараз налічваецца трынаццаць грэка-каталіцкіх суполак, дзесяць зь якіх ужо зарэгістраваны, а сьвятароў пакуль толькі чатыры.

Вуніяцтва,— адзначыў сьвятар,— нясе сваёй мэтай задзіночваць царкву, што зьяўляецца найважнейшай умовай хрысьціянства. Акрамя таго,— дадаў айцец Віктар,— царква сягоньня павінна быць па-сапраўднаму незалежнай ад дзяржавы і намэнклатуры і павінна змагацца за правы чалавека.

Коратка аб гісторыі вуніі распавядаў Ю. Тарасевіч, пасьля чаго быў паказаны відэафільм аб адраджэньні вуніяцкай царквы на Украіне. Дарэчы, фільм быў зроблены на ўкраінскай мове. Вельмі ўразіла тое, як бальшавіцкая ўлада адбірала ад людзей іх веру, нясла зьдзекі цэламу народу, які ўсё ж не пакінуў і не забыўся пра сваю рэлігію. Вунія на Украіне была скасавана на сто гадоў пазьней чым на Беларусі, відаць, таму зараз яна хутка паўстала зноў.

Вельмі прыемнай часткай гэтай імпрэзы былі хвіліны, калі перад прысутнымі распачаў выступленьне хор «Паходні» з калядными песьнямі. А на заканчэньне ўся зала разам з артыстамі выконвала стоячы «Магутны Божа».

Аднак, ня ўсё добра сягоньня складваецца ў гарадзенскіх вуніятаў. Яны і надалей ня маюць свайго храма, дзе маглі б зьбірацца і маліцца Богу. Таму, як паведамлялася на прэзэнтацыі, з новага года кожную нядзелю а 11-й гадзіне па адрасы: пр. Касманаўтаў, 4а будзе адбывацца богаслужэньне.

Ф. МАЛЕЦКАЯ.



З ІМЕМ САУДАЎСКАГА КАРАЛЯ

Рашэньнем Гарадзенскага райвыканкама ў маляўнічым кутку вёскі Ласосна побач Горадні выдзелена 20 сотак зямлі для будаўніцтва мячэці на 100 вернікаў. Як паведаміў адзін з мясцовых лідэраў мусульманскага руху сп. Ю. Крыніцкі, сьвятыня будзе збудавана па праэкту Уфімскага муфіяту (епіскату). Цікава, што гарадзенскія мусульмане жадаюць надаць новаму прыходу імя караля Саудаўскай Аравіі Фатха, які абяцаў выдзяліць на будоўлю 200 тысяч даляраў.

Г. СТРУМЕНЬ.

БУДЗЕМ ЛЯЧЫЦЦА АМЭРЫКАНСКІМ АСЬПІРЫНАМ

Сёлета не павінна быць цяжкасьцяў з бактэрыйнымі прэпаратамі: вакцынамі, сывараткамі, гама-і імунаглабулінамі. Існуе дамова зь Менскім і Барысаўскім фармацэўтычнымі заводамі на пастаўку лекаў на Гарадзеншчыну. Акрамя таго падпісаны кантракты з Вэнгрыяй, Славеніяй, Польшчай, Балгарыяй, вядуцца перамовы зь Нямеччынай.

У нашых аптэках зьявіцца і амэрыканскі асьпірын, які зараз набываюць за мяжой. А ўвогуле дастатку мэдпрэпаратаў чакаць ня варта, было б хоць самае неабходнае.

М. Д.

САМАЛЁТЫ НА ПРЫКОЛЕ

З-за дэфіцыту паліва вымушаны былі прыпыніцца шмат якія з рэйсаў аэрафлота. Як паведамілі нашаму карэспандэнту ў Гарадзенскім аэрапорце, не лятаалі ад нас самалёты на Менск. Кіеў, Санкт-Пецярберг, Растоў. Пакуль захаваліся толькі тры маршруты — штодзённы да Масквы, а таксама да Чалябінска і Алма-Аты.

М. Д.

С. АСТРАВЕЦ

ЗЬМЕНА ІМІДЖА

ТРАВЕНЬСКІЯ ЗАНАТОЎКІ

1.

Сёньня ў краме ў пакупніцкім збоі нейкая стараватая кабетка з папсаваным вокам прапанавала па-загаворшчыцку табе талён на віно... Чаму табе? Пітакі за рогам лаюцца мацерна, бо талёнаў болей няма. А ты свае чамусьцей марнуеш, чаго ня могуць уцяміць твае калегі.

Чаму ж яна з усіх абрала менавіта цябе? Які давер!.. У хаце зазірнуў у люстэрка. Стрыжаныя бы пожня валасы (бадай упершыню пасьля войска) й таксама першая мая барада. Вось табе, калі ласка, талён на віно!

З барадой было так. Думаў пачакаць, пакуль ня станеш пісьменьнікам. Але які крытэрый? Кніжка, членства ў сп? Першую ўжо два з паловай гады вытрымліваюць нібы які каньячны сьпірытус. Мне кажуць: нам падабаецца як ты пішаш, твая проза цікавая, у цябе добрая кніжка. Табе гэта й так вядома. Але выдаваць не сьпяшаюць. Вось ты й вырашыў болей не цягнуць з барадой.

Спачатку табе сказалі: выкапаны Емяльян Пугачоў. Падгаліў бараду, пастрыгся, новы камплімент — стаў нагадваць, нібы, Фідэля Кастра. Брэшуць, канешне. Нарэшце прынялі за свайго ў крамнай чарзе.

І вось ты — барадаты, маеш дзве нявыдадзеныя кніжкі й паўшуфляды іншых опусаў, «зь недрукаванай спадчыны», як гэта любяць у падобных выпадках казаць палякі. Ты пакуль сьціпла называеш сябе літаратарам.

2.

Цяпер ты разумееш, чаму ўпершыню за столькі часу пастрыгся каротка. Скончылася тваё маўклівае процістаяньне установе, называнай «партыйная газэта», амаль лысаму рэдактару, барадатаму як К. Маркс й гаваркому як Троцкі сакратару рэдакцыйнага партбюра. Вонкавым супрацівам паўторна зрабіліся твае валасы, як ужо калісьці было, калі савецкая школа душыла тваё пакаленьне, выхаванае на творах «Дып Пёпл» й «Пінк Флёйд», «Квын» й «Назарэт», «Слэйд» ды іншых, на начных музычных праграмах радыё Люксэмбурга. Вы жылі ў тым сьвеце. Гэта была адзіная, падсьвядома абраная, магчымасьць уратавацца.

Былі, праўда, і самаспробы быць як усе. Напрыклад, выдатная адзнака за сьпісанае з камсамольскае газэты сачыненьне пра Бам. Або: ты хворы, у цябе 40-градусны грып, удзень замежныя радыёстанцыі маўчаць, а ўсе астатнія перадаюць уступны даклад Брэжнева на XXV зьезьдзе Кпсс. Табе кепска, ты ня можаш ані чытаць, анічога іншага, а таму спрабуеш засяродзіцца, дапяць сэнсу дэфармаванай мовы напаўжывога гэнсэка.

Увечары радыёстанцыя «Юность» перадае новы «бамны» шлягер Ю. Антонава са словамі «По новым просекам покатят колёсики. Бам! Бам! Бам!». Табе вельмі балюча, што модны сьпявак у якасьці музычнага пройгрыша «пазычыў» уступ зь песьні «Мы — амэрыканскі ансамбаль» гурта «Грэнд Фанк». Назаўтра, крыху ачуняўшы, ты пішаш водгук на нейкі выкрываўчы артыкул у «Камс. правде», спрабуеш сьціпла абараніць музычныя праграмы «Голаса Амэрыкі», з трымценьнем падпісваеш на капэрце свой адрас.

А ў Маскве ў крамлёўскім палацы зьездаў тым часам адбываецца гістарычны форум...

3.

Апынуцца не ў сваёй талерцы — не лепшае з пачуцьцяў. Разьмеркаваньнем выпускнікоў журфаку Бду, «ідэялагічнага» факультэта, займаецца асабіста Цккпб. Вялікі гонар! Табе аказваюць давер й беспартыйным прыймаюць у «партыйную» газэту. Ты рэгулярна сядзіш зь яшчэ двума-трыма маладзейшымі, таксама безбілетнымі, на партсходзе, яўка куды для вас абавязковая... У лепшым разе твае калегі камуністыя абмяркоўваюць «мерапрыемствы аб падрыхтоўцы да працы ў зімовых умовах». У галаве тваёй тым часам пяецца штось накшталт «Нас колотят уже чем попало!..» (ДДТ).

Рок дапамог табе выжыць і ў войску. Злоўлены вухам урывак попеўкі — й твае сэрца бьецца весялей. Ты знаёмішся з гаспадаром тэлеграфнага клясу, дзе цябе навучаюць друкаваць (прыдалося ў журналісцкай працы!), ён інтэлігэнтны чалавек і вы ходзіце разам у салдацкую кавярню піць раствараяльную каву, хоць ён й фармаьна «дзед», а ты толькі пачынаеш сваё гібеньне й маркоту, велягурна названае ганаровым выкананьнем канстытуцыйнага абавязка.

Аднойчы пасьля начнога дзяжурства ты сьпіш да самага паўдня. Выходны дзень. Табе сьніцца лёккі й прывабны як у маленстве сон. Табе добра, грае «Назарэт». Не адразу, але ты прачынаешся. Навокал «пхд» (г. зв. парка-гаспадарчы дзень), памяшканьне мыюць, ложкі ссунуты й сапраўды гучыць назарэцкая «Сабачча поўсьць».

4.

Да працы мне ехаць хвілінаў 20—25. Самы прыемны маршрут. Спачатку я штодня бачу Дзяржаўны сьцяг па-над райвыканкамам. Пазьней справа мяне вітае наступны — гарвыканкамаўскі й адразу за ім лунае высока ў небе самы вялікі, пад якім гмах з габінэтамі ваблвыканкамаўцаў. Потым аўтобус зьбочвае налева: старасьвецкая камяніца аптэкі, помнік сп. Э. Ажэшкі, мост цераз р. Гарадніčанку, дом-музэй сп. Элізы. Направа і — яшчэ адзін Бел-чырвона-белы сьцяг факультэта беларускай філялёгіі ды культуры Універсітэта Я. Купалы.

Мабыць, я шчасьлівы чалавек, бо спраўдзіліся мае мары. Забароненая бальшавікамі трыяда: Бел-чырвона-белы сьцяг, Пагоня й абрэвіятура БНР жывуць! Беларусь крыху набыла беларускай фарбы. Канешне, ёй яшчэ доўга быць Беларусьсю несапраўднай. Але несапраўдная Беларусь ужо не тое ж самае, што Бсср, якая зусім не Беларусь. Як у той показцы: «А Слава Капэсэс — зусім не чалавек».

9 траўня. Нашыя сьцягі аздабляюць нават дом культуры ахвіцэраў, вайсковы штаб, Кдб й нават зусім ужо нечаканыя установы. Дарэчы, палякі ад сёлета адзначаюць сьвята ў ягоную дакладную дату — 8-га. Яны справядліва лічаць гэты крок чарговым у пазбаўленьні ад савецкага ідэялагічнага ярма. У Маскве, як вядома, перамогу адзначылі толькі на наступны дзень. Традыцыя замацавалася, яе навязалі ўсходнеэўрапэйскім сатэлітам. А ўся Эўропа тым часам адзначала 8 траўня. Ну а ў нас усё па-старому. Але гэта дробязь побач з навіной — Загадам міністра абароны Беларусі, які, праўда, распачынаецца словамі «Таварышы салдаты, сяржанты і старшыны...» Ёсьць у гэтай фразе нейкая мэлядыйнасьць, рытміка, магла б няблага сьпявацца... у якасьці вайсковага гімну ўласных Узброеных Сіл. Зрэшты, яшчэ сьмяшней гучала б «спадары салдаты, прапаршчыкі і сяржанты».

Дарэчы пра помнікі. Мінула першае патрыятычнае замілаваньне і пры помніку польскай пісьменьніцы Э. Ажэшкі болей не ляжаць кьветкі, як й на палічцы каля бюста Я. Купалы, які знаходзіцца праз вуліцу ад дома пісьменьніцы і ўзіраецца ў ягоныя вокны. Наогул кветкі да помнікаў у нас апошнім часам кладуць рэдка, хоць прадаюць іх шмат, асабліва ружаў. Але купляюць кветкі часта й дораць пераважна жанчынам й дзяўчатам, якія ў Горадні вельмі пекныя.

5.

Наогул, незалежнасьць, нават несапраўдная, ужо плюс. Апроч сьцягоў нарэшце ў крамах ёсьць кілбаса, а тонкія сасіскі я ўвогуле ўбачыў упершыню пасьля часоў застою. Вось кажуць грошы будуць свае, напачатку рублі. Чорных, праўда, аднекуль панаехала, некаторыя нават пажаніліся з нашымі дзяўчынамі, дзяцей завялі. Але большасьць ходзяць хэўрамі й ці толькі гандаль іх цікавіць? Канешне, гэта пасільны даробак Беларусі ў мірнае сканчэньне карабахскага канфлікту, якая завабіла да сябе фізічна здаровых маладзёнаў, якія здольны трымаць у рукох зброю. Зь іншага боку, а раптам яны ў нас паўладкаваліся, каб тутака купляць або нават красьці тую ж зброю для сваіх? Хто ведае. Цябе, дарэчы, некаторыя свае за іхняга ўважаюць. Але тыя аднак адчуваюць, што ты тутэйшы, нават калі зь імі на кірмашы спрабуеш размаўляць па-беларуску з каўказскім вымаўленьнем. Гэта як з тымі мурынамі, якія нам здаюцца ўсе аднолькавага колеру. А між тым, сэнэгальцы, напрыклад, зусім ня чорныя, а нейкія сіняфіялетавыя, нібы дасьпелыя сьлівы.

6.

Не, што ні кажы, але пры незалежнасьці дыхаецца лягчэй, нават асабліва не адчуваеш у паветры сярністы ангыдрыт ды іншую атруту й пра радыяцыю амаль забыліся. Свабода, гэта калі, даруйце калямбур, можна вольна падпісаць у «Саюз (!) друку» газэту «Свабода», пра арганізатара якой праф. В. Іваноўскага нельга было ўзгадваць станоўча. Свабода, гэта калі гімн «Мы, беларусы» выконваецца без словаў, якія сёньня гучаць прынамсі анекдатычна. ...гэта калі часопіс «Коммунист Белоруссии» зрабіўся «Беларускай думкай», а бальшавіцкая фракцыя ў парлямэнце прыймае назву «Беларусь». А яшчэ ж ёсьць й «Новая Беларусь», Белполь, Белвест, Беліта і г. д. Беларускае войска, якім камандуюць расейскія афіцэры, а беларускія тым часам мусяць гібець у Расеі без амаль надзеі вярнуцца на Бацькаўшчыну й служыць ёй, а не чужой дзяржаве.

7.

Наш, собскай гадоўлі, сувэрэнітэт, нагадвае табе сьвята перапрананьня, маскарад. Але ты ня ведаеш, ці сапраўды грым ды парык не ўплываюць на душу актора й паскуднік застаецца паскуднікам, зайздросьнік — самім сабой, нахабнік — таксама... У амэрыканскім мультфільме пра труса Багса ёсьць чародаўка, у якой на галовай варагуючых паміж сабой гэрояў раз за разам зьмяняюцца капялюшы: паляўнічага, паліцыянта, ксяндза і г. д. Неверагодна, але паводзіны робяцца залежнымі ад кожнага новага аблічча! Ідэялізм? Магчыма. Але ж і марачы аб незалежнасьці ды ейных атрыбутах, вы рабілі яе ідэялісты. Папросту кожная незалежнасьць мае свой смак. Бульба, канешне, не ананасы ў шампанскім, але ж не ўсё адразу!

1992 г. травень.

ПРАГНОЗ НА 1993 ГОД

Нацыянальны банк Беларусі выпусьціць наступныя купюры ў 1000, 2000 і 2500 бел. рублёў адпаведна з выявамі помніка Леніну перад Домам ураду, дамка 1-га зьезда РСДРП, а таксама бронзавай скульптурнай кампазіцыі з Я. Коласа, дзеда Талаша і Міколкі-паравоза на аднайменным сталічным пляцы.

Дзяржаўнымі мовамі побач з беларускай стануць польская, іўрыт, малдаўская, украінская, узбэцкая, летувіская і нават арабская з мурынскай, бо прадстаўнікі гэтых народаў або жывуць у нас або навучаюцца ў сталічных інстытутах.

У Нёман зноў выпусьцяць мазуту, але ўжо не ў Мастах, а ў Стаўбцах, прычым значна больш, чымсьці першы раз.

У Беларускім войску створаць адмысловую частку, праўдападобна роту або нават батальён, дзе ўсё чыста будзе выканана па-беларуску, нават надпісы ў прыбіральні. Сюды будуць прывозіць на экскурсію замежных турыстаў.

Валянціна Церашкова нарэшце папросіць беларускага пашпарту падданства. Яго таксама атрымаюць усе злачынцы СНД, якія адседжваюцца ў нашых турмах.

У другія ўгодкі рэфэрэндуму аб захаваньні СССР здарыцца моцная паводка, Нёман выйдзе па-за берагі, умкне за мяжу цеплаходы гарадзенскага рачнога параходзтва і паўторна падмые Каложу.

Зіма чакаецца сьцюдзёнай, з маразамі да 34-36 мінус, рыбе будзе не хапаць пад лёдам паветра.

Садам Хусэйн сакрэтна папросіць у Беларусі лішнюю ядзерную зброю ў абмен за нафту. Беларусь, зразумела, прапануе замест зброі бульбу.

Улетку пройдуць дажджы з навальніцамі і стане цёпла. Ураджай атрымаецца някепскі, дзякуючы чаму калгасны лад захаваецца на наступны тэрмін.

Біл Клінтан пісьмова павіншуе беларусаў ЗША з чарговымі угодкамі БНР. Прэзідэнт БНР у Амэрыцы Язэп Сажыч сфармуе новы ўрад з патрыятычна настроеных мастакоў і пісьменьнікаў.

«Народная газэта» дасягне тыражу 1-2 млн паасобнікаў.

Філарэт упершыню загаворыць па-беларуску. Царква зробіцца аўтакэфальнай, а потым паўторна зьліецца з касьцёлам паводле мэтаў сусьветнага экумэнічнага руху.

Кэнігзбэрг зноў зробіцца Каралеўцам. На яго стануць прэтэндаваць Польшча з Летувой, таму ў ААН будзе разгледжана пытаньне аб яго далучэньні да РБ.

Нейкі Прушынскі, калі яму адмовяць у беларускім грамадзянстве, створыць у эміграцыі польскі ўрад Беларусі.

Украінцы са згоды беларускага ўраду будуць перахоўваць у Пінску некаторыя дробнатажныя караблі Чарнаморскага флоту, з-за чаго пагоршацца нашы дачыненьні з Расеяй, якая прымусіць адмовіцца ад «зуброў» і застацца ў рублёвай зоне.

І. Шамякін атрымае Нобэльскую прэмію за раман «Петраград-Брэст». Саюз пісьменьнікаў стане называцца Пэн-клюбам.

Гімнам БССР назаўсёды застанецца песьня «Мы, беларусы...»

Помнік Суворава вынясуць з сувораўскага вучылішча й паставяць непадалёк на вуліцы — каля беларускага міністэрства абароны.

Паміж Усходняй і Заходняй Беларусьсю пабудуюць бэрлінскі мур. Грошы дадуць як і ў 1921 годзе, урады дзьвюх суседніх краін.

Выпусьцяць першыя нацыянальныя пазалочаныя ордэны: з выявамі Георгія Скарыны, Георгія Пабеданосца і беларускай птушкі бусла.

Камуністы Беларусі адновяць КПСС і гарэлка зноўку стане па 3.62, але на талён будуць даваць толькі адну бутэльку.

Праўдападобна, зьвергнуць Фідэля Кастра.

Сергіюш.

У час калядаў

Музычныя спатканьні пры каралеўскім тракце

26 сьнежня ў Лялечным тэатры адбылася вечарына бардаўскай песьні. Яна атрымала назоў «Губэрталіяў» ад імя сяраднявечнага патрона нашага старога места. Зафундавалі музычныя спатканьні на Каляды фонд «Бацькаўшчына» і асобна м/п «Васілёк», а таксама аб'яднаньне «Гроднаэнэрга».

Распачалася вечарына калядной гульнёй са сьпевамі пахаднянцаў зь іхнім добрым хорам. Яны разьвесялілі й дадалі гумору ўсім прысутным. Першым вельмі прыемна адсьпяваў дзьве свае песьні пад гітару Сяргей Лаўнік. Затым у зале запанавала музыка, стылізаваная пад старажытна-беларускую, якую выканаў гурт з Менску «Камэлот». Усе гэтыя выканаўцы атрымалі ад фундатараў у падарунак па электраасялку «Міс Рэмінгтон».

Як старога знаёмца спаткалі гарадзенцы аднаго з першых беларускіх бардаў Алеся Камоцкага, які толькі што вярнуўся з Польшчы. Яму спрэзэнтавалі набор відэльцаў з нажамі. Бард крыху разгублена пажартаваў: маўляў, яму яны могуць і не спатрэбіцца. Перад гэтым Алесь гаварыў, што жыве ў лесе. Засталося незразумелым ці яму няма чаго там есьці, ці даводзіцца рабіць гэта рукамі...

Уразіў манерай выканаўня аршанец Алег Мельнікаў, ад якога пачулі моцную песьню пра Аршанскую бітву, а таксама — пра камуністычны рай на рацэ Хуанхэ. Ён атрымаў у падзяку хатні электрапрыбор. Апошнім сьпяваў хоць «бедны і худы», але гаспадар — Віктар Шалкевіч, які, дарэчы, і вёў вечарыну. Віктар запачаткаваў у беларускай бардаўскай песьні калядную тэму, а таксама выканаў пару сваіх блюзаў з ярлыкам чорнага гумару, адзін з якіх — пра Вызваленчы паход 39 году — прысьвяціў сям'і сп. Вітольда Іваноўскага. Шалкевічу дастаўся радыёпрыймальнік «Акіян», каб мог слухаць Беларускую праграму Беластоцкага радыё, у якой часьцяком гучаць ягоныя творы.

БАЗЫЛЬ.



УВАГА! КОНКУРС

Беларуская каталіцкая Грамада, Задзіночаньне каталіцкай моладзі Беларусі, Музэй Максіма Багдановіча і парафія касьцёла сьв. Тройцы (сьв. Роха) у Менску абвяшчаюць першы Ўсебеларускі конкурс дзіцячага малюнку «БОГ — МОЙ СВЯТА». Яго мэта — абудзіць і разьвіваць хрысьціянскія пачуцьці ў дзяцей.

Тэмы конкурсу: «Падзея са Старога Запавету Біблі» і «Падзея з Новага Запавету Біблі». Удзельнічаць у ім могуць дзеці да 12 гадоў. Да разгляду прадстаўляюцца ня больш як дзьве працы па адной або па дзьвюх тэмах. Фармат 24 на 36 см. Малюнкі могуць быць выкананы ў любой тэхніцы.

Дзіцячыя працы дасылайце на адрас: 220029, г. Менск, вул. Багдановіча, 7а (да 23 сакавіка 1993 г.). Абавязкова ўкажыце імя, прозьвішча, узрост і поўны адрас аўтара.

Для пераможцаў прадугледжаны прэміі і падарункі.

Запрашаем спонсараў і суарганізатараў! Наш тэлефон: (0172) 27-04-67.

ШАНОЎНЫЯ дапісчыкі «Пагоні»! Нагадваем: наша газэта ганарарная, таму за ўсе надрукаваныя допісы іх аўтарам налічваюцца грошы. Але, на жаль, далёка ня ўсе па іх прыходзяць. Таму яшчэ раз запрашаем да сябе ўсіх нашых дапісчыкаў. Зьвяртайцеся на адрас вул. Дамініканская, 1.

НЛА над Гроднам у XVII стагодзьдзі?

Кніга XVI стагоддзя, якая паходзіць з асабістай бібліятэкі гарадзенскага вучонага-дамініканца Дамініка Сівіцкага, захавала на канцы прыпіску — сьведчаньне назіраньня незвычайнай з'явы.

Зьмест кнігі — фаліянту складаюць перапісаныя кірыліцай чатыры кананічныя Эвангельлі, на канцы прыпіска почыркам XVII стагоддзя наступнага зьместу: «Року тысяча шэсьцьсот пяцьдзесят чацьвёртага (1654) месяца Аўгуста дванаццатага дня паводле Рымскага календара знак на небе паказаўся надзвычаркам, сьвячэньне было рана, а дзявятай гадзіне, месяц быў і зьвязда была рана а гадзіне дзявятай, месяц быў і зьвязда напэўна яму служыла; за караля яго міласьці Яна Казіміра то было, а за дзяржавы яго міласьці пана Яна Мілясеўскага маёнтку і царквы Горніцкае. Іоан Сашка, гродзенскі пратапопа сваёй рукою».

Паўторы ў мове, таксама як і блытаньне слоў беларускіх і польскіх сьведчаць, што гарадзенскі пратапопа быў моцна ўсхваляваны ад тае зьявы, якую ён назіраў і пра якую палічыў патрэбным занісаць у напрастольнае Эвангельле. Тым часам мы маем дастаткова падстаў, каб лічыць гарадзенскага пратапопу Іаана Сашку першым беларускім УФОлагам.

М. МІКАЛАЕЎ, СПб.

ГАРЭЛКУ ПІЛІ ВЁДРАМІ

Як паведамлялася ў сьнежні 1882 года гарадзенская губэрнская газэта, фунт палявдзіцы на таргах прадаваўся за 13 капеек, бараніны — 8, сала сьвінога — 30, шчупака вялікага — 20, ляшча, акуня і судака сьвежых — 25 капеек. Вядро гарэлкі ў тыя часы можна было купіць за 4 рублі 10 капеек, а пуд жытняй мукі — за рубель.

Цікава толькі, якія тады былі заробкі? Пра гэта ў газэце не паведамлялася.

М. В.



Фота А. Уладасевіча.

ПАГОНЯ

Рэдактар Сяргей АСТРАЎЦОЎ.

Адрас рэдакцыі: 230023, г. Горадня, вул. Дамініканская, 1.
Тэлефоны: 45-29-96, 45-41-83.

Выходзіць штодватыдні па пятніцах.

Заснавальнік КАФ «БАЦЬКАЎШЧЫНА»

Наша газэта ёсьць БЕЛАРУСКАЙ ТРЫБУНАЙ, адкрытай для выказваньня розных пунктаў гледжаньня, розных аўтараў зь любых краін, гарадоў і вёсак. Меркаваньні аўтараў публікацый не абавязкова могуць супадаць зь меркаваньнем рэдакцыі.

Індэкс 63124.
Фотанабор, афсэтны друк.
Гарадзенская вабласная ўзбуйненая друкарня.
230003, г. Горадня, вул. Паліграфістаў, 4.
Тыраж 2025 паасобнікаў. Замова 16
Нумар падпісаны да друку 5.1.1993.